

«ІНВЕСТЫЦЫІ» Ў ЧУЖУЮ КІШЭНЮ 7

ГЕРОІ КАЛІНКАВІЧ І МАЗЫРА 11




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

3 ЛЮТАГА 2024 г. СУБОТА № 24 (30158)

## КОРАТКА

• **У выхадныя нарады ДПС па ўсёй краіне ўдзеляць павышаную ўвагу выкананню Правіл дарожнага руху.**

• Наступны перапіс насельніцтва пройдзе ў Беларусі ў 2030 годзе.

• **Попыт сярэдняга і малога бізнесу на банкаўскія пазыкі ў 2023 годзе вырас больш як на 40 працэнтаў.**

• Сетку ўніверсітэцкіх клінік створаць у нашай краіне.

• **У Беларусі стане больш медустаноў, дзе можна прайсці медагляд.**

• У Віцебскай вобласці да канца года знята забарона на звышнарматыўны вываз прадуктаў у Латвію і Літву.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Для Беларусі як для прамыслова развітой краіны вельмі важная лічбавізацыя рэальнага сектара эканомікі. Магчымасці прамысловага інтэрнэту рэчаў, лічбавых двайнікоў, новых тэхналогій сувязі здольныя вывесці вытворчасць на новы ўзровень, забяспечыць рост прадукцыйнасці працы і канкурэнтаздольнасці прадукцыі. Для рэалізацыі гэтага кірунку ў бягучым годзе запускаецца праект па стварэнні і ўкараненні на базавых прадпрыемствах краіны прамысловай лічбавай платформы з улікам канцэпцыі «Індустрыя 4.0». Яна дасць магчымасць інтэграваць створаныя ў сферы прамысловасці функцыянальныя дадаткі і павысіць аўтаматызацыю ўсяго цыкла вытворчасці».*

ISSN 1990 — 763X

З першых вуснаў

# «ТРЭБА ЎДАСКАНАЛЬВАЦЬ РАБОТУ І ВЫХОДЗІЦЬ НА БОЛЬШ ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ»

### Ад айчынных лыж да сельгассховішчаў: якія задачы стаяць перад Кіраўніцтвам спраў Прэзідэнта

**Аляксандр Лукашэнка прыняў з дакладам кіраўніка спраў Прэзідэнта Беларусі. Напачатку беларускі лідар адзначыў, што Юрый Назараў ужо другі год знаходзіцца на гэтай пасадзе. Прэзідэнт нагадаў, што перад Кіраўніцтвам спраў было пастаўлена шмат пытанняў і задач, якія канкрэтызаваліся і ўдакладняліся ў ходзе работы.**



Фота БелТА.

### «Пытанне дзяржаўнае»

«Я ўважліва вывучыў вынікі работы арганізацый, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Адзінае, магу сказаць, каб за гэтымі агульнымі лічбамі мы бачылі і праблемы. Бо ёсць арганізацыі (у цябе іх 67), якія працуюць і не так паспяхова, на якія трэба больш сур'ёзную ўвагу звярнуць». Пры гэтым Прэзідэнт параўнаў добрыя вынікі з лесам, за якім можна не заўважыць куста (гэта значыць праблему).

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што вынікі, у тым ліку фінансавыя, арганізацый і прадпрыемстваў, якія адносяцца да Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта, нядрэнныя. «І па галінах: і сельская гаспадарка, і будаўніцтва, і «Белмастацпромыслы», — удакладніў беларускі лідар. — Усе лічылі раней, што Кіраўніцтва спраў — гэта сабраў прынадныя кавалкі дзесьці, і жыццё «ў шакаладзе». Не! Канцэрн «Белмастацпромыслы» чаго варты. Але ёсць кірункі, якія мне хацелася б, каб Кіраўніцтва спраў развівала: накшталт музычных інструментаў і іншае. Наша нацыя — музычная, адукаваная ў гэтым плане, а мы ў асноўным купляем імпартнае. Нешта там паспрабавалі ў Барысаве аднавіць, на гэтым і заглухла. Гэта, вядома, пытанне дзяржаўнае, не толькі Кіраўніцтва спраў».

У сувязі з гэтым Юрыю Назараву, як вопытнаму чалавеку, даручана пагядзець і на дзяржаўныя арганізацыі, якія павінны падключыцца і зрабіць максімум для развіцця гэтага кірунку. «Ён няпросты, але калі Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта за гэта не возьмецца, ніхто аператыўна гэтае пытанне не вырашыць і не падыме гэтую галіну», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Звярнуў увагу Прэзідэнт і на работу прадпрыемства па выпуску лыж і іншага спартыўнага інвентару «Целяханы». «Таксама трэба абавязкова ўдасканальваць работу і выходзіць на больш высокі ўзровень», — даручыў кіраўнік дзяржавы.

Па яго меркаванні, у Беларусі, якая з'яўляецца адносна паўночнай краінай, дзеці павінны больш часу праводзіць на вуліцы. «А вуліца сёння — гэта лыжы перш за ўсё, — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — Трэба са школьных гадоў прывіваць ім гэтыя веды, вопыт для таго, каб здаровыя проста людзі былі, а не сядзелі ў інтэрнэце і не тыцкалі ў тэлефон». СТАР. 2

Пасля размеркавання

# На работу — раненька

### Двайняты Кацярына і Лізавета МАРЗАН больш за паўгода працуюць ветэрынарнымі фельчарамі сельгаспрадпрыемства

**Каця і Ліза не проста вясёлыя, сімпатычныя 19-гадовыя дзяўчаты. Кацярына Андрэеўна і Лізавета Андрэеўна — спецыялісты, яны ветэрынарныя фельчары сельгаспрадпрыемства. І пакуль іх равеснікаў мамкі нават яшчэ і не думаюць будзіць на заняткі, нашы гераіні падхопліваюцца а палове шостай, хуценька збіраюцца, п'юць чай, бо ў шэсць раніцы нярэдка трэба ўжо быць на ферме.**



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

СТАР. 5

Спажывец

# АДНА КУРЫЦА ДАРАЖЭЙШАЯ ЗА ПУД СЛІЎ

### Што і па якіх цэнах можна было набыць на рынку сто гадоў таму

**Як сцвярджаюць гісторыкі, грошы чалавецтва прыдумала ў VII—VI стагоддзях да нашай эры. І тады ж чалавек адкрыў для сябе задавальненне трацiць гэтыя самыя грошы на патрэбныя і непатрэбныя рэчы. А вытворцы тавараў і паслуг, у сваю чаргу, сталі вучыцца прыцягваць пакупніка, робячы першыя нясмелыя крокі на шляху маркетынгу.**




**Знакаміты «Каляндар калгасніка», які карыстаўся попытам па ўсім Савецкім Саюзе.**

Зрэшты, глыбіні стагоддзяў пакінем археолагам, зазірнем усяго толькі крыху менш чым на стагоддзе таму. У якую суму абыходзіўся нашым прабабулям і прадзедам паход на рынак?

Каб адказаць на гэта пытанне, адпраўляемся ў аддзел стададрукаў і рэдкіх кніг Прэзідэнцкай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Фонды аддзела — больш за 70 тысяч адзінак унікальных выданняў, самае старажытнае з якіх датуецца 1537 годам (выданне на лацінскай мове па праве). СТАР. 8

# «ТРЭБА ЎДАСКАНАЛЬВАЦЬ РАБОТУ І ВЫХОДЗІЦЬ НА БОЛЬШ ВЫСОКІ ЎЗРОВЕНЬ»

**«Трэба працаваць і раскручвацца»**

Спыніўся кіраўнік дзяржавы і на рабоце сельскагаспадарчых арганізацый, якія ўваходзяць у структуру Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што была дамоўленасць пабудаваць у Магілёўскай вобласці замест старых вытворчасцяў па перапрацоўцы малака новыя.

Пастаўлена задача — больш актыўна задзейнічаць базы захоўвання, якія ёсць на балансе Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта. «Мы аб гэтым казалі на прыкладзе «Александрыйскага», — канкрэтызаваў кіраўнік дзяржавы. — Добрае сховішча пабудавана. У мінулым годзе або пазамінулым яно ўвогуле пуставала. Гэта не справа. Іх (базы захоўвання. — «**Зв.**») трэба прывесці ў парадак і пастаянна там захоўваць. Не бульбу, а захоўваць яблыкі, іншыя пладова-ягадныя прадукты, якія можна выгадна прадаць. Рынак вялізны, неабсяжны. Расійскі рынак, Кітай просяць прадукты харчавання ва ўсё большым аб'ёме. Чуў аб тым, што яны хочуць прасіць нас, каб мы пастаўлялі ім свініну. Таму рынкаў сёння хапае, і даволі прэміяльных. Нам у гэтых адносінах трэба працаваць і раскручвацца».

Юрый Назараў расказаў, што прадпрыемства «Белмастацпромыслы» цяпер развіваецца, на ім ствараюцца ўнікальныя вырабы народных мастацкіх промыслаў і сувенірнай прадукцыі. «Мы сёлета пачалі вытворчасць сожскай скані — з розных парод драўніны, стружкі атрымліваюцца выключныя рэчы, — канкрэтызаваў ён. — Вырабы класныя, таму мы гэта захоўваем».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### У тэму

У размове з журналістамі **кіраўнік спраў Прэзідэнта Беларусі Юрый НАЗАРАЎ** расказаў, што Аляксандр Лукашэнка даў добрую ацэнку іх рабоце. «Мы выканалі ўсе паказчыкі, закрылі год з добрымі фінансавымі вынікамі», — канкрэтызаваў ён.

Аднак, па словах кіраўніка справамі Прэзідэнта, спыніўся беларускі лідар і на праблемных момантах, у сувязі з чым даў канкрэтныя даручэнні. «Асобна далажылі аб рабоце прадпрыемства «Белмастацпромыслы», бо гэта тэма важная і Прэзідэнт яе трымае на кантролі, — заўважыў Юрый Назараў. — Абмяркавалі і тэму лішніх вытворчых плошчаў. Я далажыў наш падыход па развіцці слуцкага прадпрыемства, дзе мы будуем асобны новы, сучасны вытворчы корпус, кампактны, тэхналагічны, каб мінімізаваць затраты. Прэзідэнт гэта падтрымаў. Мы так будзем паэтапна працаваць па астатніх прадпрыемствах».

Шэраг даручэнняў датычыцца развіцця сельскагаспадарчага кірунку дзейнасці прадпрыемстваў Кіраўніцтва спраў Прэзідэнта. «Неабходна павялічыць аб'ёмы перапрацоўкі, паглядзець на новыя рынкі, асабліву ўвагу ўдзяліць Кітайскай Народнай Рэспубліцы, бо там ёсць пэўныя напрацоўкі, я думаю, мы іх задзейнічаем, — дадаў ён. — Па рэалізацыі новых праектаў я далажыў Прэзідэнту. У прыватнасці, мы будзем будаваць новы малакаперапрацоўчы завод у Шклоўскім раёне. Прэзідэнт падтрымаў».

Закраналася падчас сустрэчы з беларускім лідарам і тэма развіцця санаторыяў. Юрый Назараў адзначыў, што плануецца пашырыць спальныя карпусы санаторыяў «Сосны» і «Баравое», каб яны маглі прымаць большую колькасць людзей і зарабляць сродкі на развіццё ўласнай базы. «Мы дапаможам ім стварыць інфраструктуру, а далей дадзім магчымасць зарабляць», — падкрэсліў кіраўнік спраў Прэзідэнта.

Кажучы аб кадравым пытанні, Юрый Назараў заўважыў, што залог паспяховай работы — на паверхні: даць людзям добры заробак, забяспечыць іх жыллём і зрабіць так, каб было цікава працаваць. І такія прыклады ёсць. У прыватнасці, гэта датычыцца Бярэзінскага біясфернага запаведніка, на тэрыторыі якога (у вёсцы Домжарыцы) будуецца арэнднае жыллё, узводзяцца аб'екты сацыяльнай інфраструктуры, што стварае магчымасці для прыцягнення і замацавання маладых спецыялістаў.

# «Прыцягваю ўсіх вопытных людзей, каб у гэты складаны перыяд нам дзесьці не здзейсніць памылкі»

## Прэзідэнт прызначыў кіраўніка сакратарыята Усебеларускага народнага сходу

**Сакратарыятам найвышэйшага прадстаўнічага органа народаўладдзя Рэспублікі Беларусь — Усебеларускага народнага сходу — будзе кіраваць Валерый Міцкевіч, які цяпер з'яўляецца намеснікам Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання.**

Кіраўнік дзяржавы назваў гэта прызначэнне пытаннем дваякага характару. «Па-першае, больш шырокае: не хацелася б страціць прафесіяналаў нашага парламента, — патлумачыў Аляксандр Лукашэнка. — І вас я, вядома, адношу да такіх людзей — высокапрафесійных, вопытных».

Прэзідэнт дадаў, што Валерый Міцкевіч як юрыст прайшоў многія ступені і зрабіў нямала. І водгукі людзей, па яго словах, у гэтых адносінах вельмі высокія.

«Па-другое, я прыцягваю ўсіх вопытных людзей, каб у гэты складаны перыяд нам дзесьці не здзейсніць памылкі, — звярнуў увагу беларускі лідар, тлумачачы кадравае рашэнне. — Напэўна, сам адчуваеш, што ідзе такая перабудова, пераарганізацыя органаў улады ў сувязі з наданнем Усебеларускаму народнаму сходу канстытуцыйных паўнамоцтваў».

Прэзідэнт падкрэсліў, што УНС становіцца канстытуцыйным органам. І ў найбліжэйшыя гады ў сувязі са з'яўленнем Усебеларускага народнага сходу і яго пэўных сур'ёзных уладавых канстытуцыйных паўнамоцтваў, па словах кіраўніка дзяржавы, важна не дапусціць хаосу ва ўладзе. «Хаос ва ўладзе імгненна пераносіцца ў грамадства», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка. На думку беларускага лідара, Валерый Міцкевіч на пасадзе кіраўніка апарата Усебеларускага народнага сходу на гэтым этапе можа ўнесці годны ўклад у развіццё абстаноўкі наверсе.

Аляксандр Лукашэнка папярэдзіў прызначэнца, што работы будзе шмат: трэба арганізавана правесці першае пасяджэнне Усебеларускага народнага сходу, выпрацаваць рэгламент. «Трэба зрабіць усё, што мы павінны зрабіць на першым пасяджэнні, — звярнуўся ён да Валерыя Міцкевіча. — А гэта і кадравыя пэўныя пытанні вельмі сур'ёзныя. Мне прапанавалі праект указа па сакратарыяце: паўнамоцтвы, функцыянал, персаналіі і іншае. Я пакуль яго не падпісаў. Як чалавеку вопытнаму, трэба падцягнуць да сябе адпаведныя кадры і паглядзець сур'ёзна. Магчыма, унясеш пэўныя прапановы. Думаю, тыдня дастаткова для таго, каб унесці. А далей будзе відаць. У цябе вопыт вялікі не толькі апаратны, але ты ж суддзя сам, карані твае ідуць у судзейства. Заўсёды помніцца тое, адкуль пачынаў».

Прэзідэнт адзначыў, што потым будзе вызначана, якім чынам дзейнічаць. «А пакуль, калі ты не супраць, я б усё-такі прапанаваў табе ўзначаліць на гэтым этапе і сфарміраваць сакратарыят УНС, заняцца работай па падрыхтоўцы Усебеларускага народнага сходу, — звяртаючыся да Валерыя Міцкевіча, рэзюмаваў кіраўнік дзяржавы. — Аргкамітэт створаны, узначальвае яго прэм'ер-міністр. Але, якую б пасаду ні займаў, табе прыйдзецца руліць і разрульваць гэтыя пытанні».

### У тэму

У размове з журналістамі **кіраўнік сакратарыята Усебеларускага народнага сходу Валерый МІЦКЕВІЧ** паведаміў, што сакратарыят Усебеларускага народнага сходу будзе займацца арганізацыяй і падрыхтоўкай першага пасяджэння УНС і іншых. «У адпаведнасці з Канстытуцыяй першы Усебеларускі народны сход павінен быць праведзены не пазней 60 дзён пасля адзінага дня галасавання, — нагадаў ён. — Крайні тэрмін — канец красавіка. Можна раней».

Валерый Міцкевіч расказаў, што ў найбліжэйшы час будзе весціся работа па стварэнні сакратарыята УНС. «Гэта будзе невялікі, кампактны орган, — заўважыў ён. — У апараце людзі будуць працаваць на прафесійнай аснове. Будзем размяшчацца ў тых адміністрацыйных будынках, якія сёння ёсць. Папярэдне, гэта будынак Адміністрацыі Прэзідэнта».

Па словах кіраўніка сакратарыята Усебеларускага народнага сходу, Прэзідэнт сарыентаваў на сур'ёзную, адказную работу. «Гэта і навізна, і адказнасць, — адзначыў, кажучы пра свае новыя абавязкі, Валерый Міцкевіч. — Гэта найвышэйшы прадстаўнічы орган, у яго вельмі сур'ёзныя паўнамоцтвы. Адпаведна, падыходзіць да арганізацыі яго работы трэба вельмі і вельмі адказна».

Ён нагадаў, што неўзабаве будуць праведзены выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў і мясцовых Саветаў дэпутатаў, затым будуць выбраны члены Савета Рэспублікі. «Пасля прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці выберуць сваіх дэлегатаў — і тады, можна сказаць, будзе створаны Усебеларускі народны сход, пасля чаго яго можна склікаць», — рэзюмаваў Валерый Міцкевіч.

# НОВЫЯ ПРЫЗНАЧЭННІ — У КАМІТЭЦЕ ДЗЯРЖКАНТРОЛЮ І КАМІТЭЦЕ ДЗЯРЖБЯСПЕКІ

**Аляксандр Лукашэнка прызначыў намесніка старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю — дырэктара Дэпартамента фінансавых расследаванняў. Ім стаў Андрэй Самбук, які дагэтуль узначальваў следчае ўпраўленне Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Прынята рашэнне аб прызначэнні Канстанціна Бычака начальнікам следчага ўпраўлення Камітэта дзяржаўнай бяспекі.**

«Я запрасіў вас для таго, каб абмеркаваць, з аднаго боку, пытанні функцыянавання ў агульных рысах і дзейнасці дзвюх нашых найважнейшых сілавых структур, — паведаміў Прэзідэнт. — Размова ідзе аб Камітэце дзяржбяспекі і фінансавай разведцы, як мы яе калісьці называлі. Перададзена была (яна. — «**Зв.**») у Камітэт дзяржкантролю. Праблем хапае. Аб гэтым мы яшчэ пагаворым».

Другое пытанне, якое абумовіла сустрэчу ў такім складзе ў кабінеце кіраўніка дзяржавы, — кадравае: у сувязі з вакансіяй кіраўніка Дэпартамента фінансавых расследаванняў.

«Там нам трэба надаць пэўны напрамак, магчыма, звязаны больш з сістэмнай работай, як гэта ў Камітэце дзяржбяспекі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Я схільны да таго, каб вас туды, Андрэй Васільевіч, накіраваць на гэтую пасаду кіраўніком. А Канстанцін Фёдаравіч (намеснік начальніка Следчага ўпраўлення КДБ Беларусі Канстанцін Бычак. — «**Зв.**»), пакольні ён зусім яшчэ малады чалавек, папрацуе ў Камітэце дзяржбяспекі. Новае пакаленне. Я заўсёды аб гэтым гавару. Вам давядзецца яшчэ працаваць і працаваць, і на больш высокіх пасадах. Таму аб гэтым таксама не забывайце».

### У тэму

Адказваючы на пытанні супрацоўнікаў СМІ, **намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю — дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў Андрэй САМБУК** адзначыў, што падчас прызначэння кіраўнік дзяржавы даручыў прыняць комплекс мер, накіраваных на далейшае развіццё органаў фінансавых расследаванняў, паставіў задачы перад Дэпартаментам фінансавых расследаванняў.

«Органы фінансавых расследаванняў з'яўляюцца звяном сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, — канстатаваў ён. — Перад імі стаяць такія асноўныя задачы, як забеспячэнне эканамічнай бяспекі, абарона інтарэсаў нашай дзяржавы і грамадства ад супрацьпраўных замахаў у эканамічнай сферы, абарона правоў і законных інтарэсаў грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і арганізацый у эканамічнай сферы».

Андрэй Самбук дадаў, што Прэзідэнт звярнуў увагу на выяўленне і спыненне злачынстваў, правапарушэнняў у гэтай сферы, барацьбу з карупцыяй. Выкананне пастаўленых задач стаіць на кантролі кіраўніка дзяржавы. «Супрацоўнікі Дэпартамента фінансавых расследаванняў з'яўляюцца прафесіяналамі сваёй справы, патрыётамі нашай краіны, — падкрэсліў намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю — дырэктар Дэпартамента фінансавых расследаванняў. — Таму магу заверыць, што ўсе пастаўленыя кіраўніком дзяржавы даручэнні і задачы будуць выкананы ў поўным аб'ёме».

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.**

Парламенцкі дзённік

# СУПРАЦОЎНІЦТВА ПА ЎСІХ КІРУНКАХ

**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з дэлегацыяй Дзяржаўнага Савета Рэспублікі Татарстан на чале са Старшынёй Савета Фарыдам МУХАМЕТШЫНЫМ.**

«Рэспубліку Беларусь і Рэспубліку Татарстан звязваюць добрыя, сяброўскія адносіны — у гэтым няма ніякага сумнення. Наша супрацоўніцтва развіваецца абсалютна па ўсіх кірунках. Пацвярджэнне таму — шматлікія візіты, якія праходзяць у нашу краіну, і той тавараабарот, які сёння ёсць паміж нашымі рэспублікамі», — сказала Наталля Качанава.

Паводле слоў спікера, развіваецца супрацоўніцтва па лініі ўрадаў і асобных міністэрстваў, у тым ліку ў сферы сельскай гаспадаркі. З беларускага боку актыўныя канцэрны «Белнафтахім», «Беллегпрам», «Белдзяржхарчпрам». Разам з тым, паводле слоў Наталлі Качанавай, яшчэ наперадзе сур'ёзная работа.

Старшыня Савета Рэспублікі заўважыла, што сустрэча праходзіць напярэдадні важных палітычных падзей у Беларусі і Расіі. Таксама гэты год адзначаны знакавай датай — 80-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у сувязі з чым у краіне будуць праходзіць святочныя мерапрыемствы, на якіх спікер была б рада бачыць і гасцей з Татарстана. Наталля Качанава нагадала, што ў Беларусі нядаўна адзначалі 80-годдзе вызвалення Ленінграда ад блакады.

Асобна спікер спынілася на маючым адбыцца Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, які сёлета пройдзе 27—28 чэрвеня ў Віцебску, Полацку і Наваполацку. «Мы хочам паказаць вам не толькі прамысловы, але і культурны патэнцыял нашай краіны, вытокі нашай дзяржаўнасці, — сказала яна. — Мы спадзяёмся, што дэлегацыя Татарстана будзе прысутнічаць на Форуме рэгіёнаў. Мы будзем падпісваць новыя кантракты і пагадненні, над якімі працуюць ужо калегі ва ўсіх абласцях нашай краіны».

Наталля Качанава звярнула ўвагу і на важнасць супрацоўніцтва моладзі дзвюх рэспублік. Спікер расказала, што пры Нацыянальным сходзе Беларусі створаны маладзёжны савет. «Нашы маладыя актывісты актыўна працуюць з хлопцамі і дзяўчатамі з Расійскай Федэрацыі. Ужо трэці год будзе рэалізоўвацца праект «Цягнік Памяці», — адзначыла яна.

Гаворачы аб гэтым патрыятычным праекце, спікер расказала, што ў мінулым годзе, акрамя моладзі з Беларусі і Расіі, у ім удзельнічалі прадстаўнікі Кыргызстана і Арменіі. А сёлета плануецца падключыць Азербайджан. Акрамя таго, вядзецца работа з Казахстанам і Узбекістанам.

Вяртаючыся да тэмы візіту дэлегацыі, Старшыня Савета Рэспублікі выказала спадзяванне, што ён будзе прадукцыйным. «Шчыра жадаем вам паспяховага знаходжання ў нас у Беларусі», — сказала яна.

**Паводле БелТА.**

# ЯК НАБЫЦЬ ЖЫЛЫ ДОМ ЗА АДНУ БАЗАВУЮ

## Адзін з варыянтаў — аформіць пусты будынак у вёсцы ці ў горадзе

**Як знайсці пусты дом? Па-першае, трэба скарыстацца адзіным рэестрам пустых дамоў на сайце Дзяржкаммаёмасці. Рэестр дзейнічае з пачатку мінулага года, ён агульнадаступны і бясплатны. Інфармацыя аб пустых дамах у рэестры размяшчаецца пасля іх выяўлення камісіяй мясцовага выканкама.**



Тут жа можна даведацца аб пераліку пустых дамоў у пэўнай мясцовасці або населеным пункце Беларусі. Фільтры дапамогуць задаць неабходныя параметры: вобласць, раён, горад, стан. Можна глядзець усе прапановы запар або выбраць толькі тыя дамы, якія прадаюцца. **Дарэчы, з дапамогай рэестра можна знайсці звесткі не толькі пра дамы, але і пра пустыя кватэры.** Там вы даведаецеся фактычны адрас, месцазнаходжанне на карце, характарыстыкі дома (матэрыял сцен, плошча, памер і іншае). Там жа ёсць інфармацыя пра ўзрост дома і яго стан, знешні выгляд і плошчу зямельнага ўчастка.

Потым трэба звяртацца ў мясцовы выканкам (раённую адміністрацыю ў горадзе) па месцы знаходжання дома або ў арганізацыю, якая праводзіць аўкцыён. Купіць пусты жылы дом могуць у тым ліку замежныя грамадзяне, асобы без грамадзянства, індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы.

Пустыя дамы прадаюць на аўкцыёнах (у тым ліку шляхам электронных таргоў) або шляхам прамога продажу. Інфармацыя пра спосаб продажу (з аўкцыёну або без яго) і кошт дома размяшчаецца ў рэестры на старонцы «Інфармацыя аб продажы». Рашэнне аб выкарыстанні дома, у тым ліку аб яго продажы, выканкам прыме праз 30 дзён з дня ўступлення ў сілу рашэння суда аб прызнанні пустога дома безгаспадарным і перадачы яго ў дзяржуласнасць.

Выканкам праводзіць аўкцыён самастойна альбо даручае яго правядзенне спецыялізаванай дзяржарганізацыі. Пачатковую цану продажу фарміруе, зыходзячы з рынкавай, арганізацыя па дзяржрэгістрацыі нерухомасці.

У выпадку, калі на аўкцыён з'явіўся адзін удзельнік, прадмет аўкцыёну прадаецца яму па пачатковай цане, павялічанай на 5 %. Калі аўкцыён не адбыўся, прызначаюць паўторныя таргі з паступовым зніжэннем цаны: спачатку — на 50 %, затым — на 80 % і гэтак далей аж да 1 базавай велічыні.

Населеныя пункты, у якіх пачатковы кошт продажу з аўкцыёну або без яго можа быць адразу роўны 1 базавай велічыне, вызначаюць аблвыканкамы. Выключэнне — Мінск і абласныя цэнтры.

Дагавор аб куплі-продажы з пераможцам заключаць толькі пасля таго, як ён на працягу 10 дзён пасля зацвярджэння пратакола цалкам выплаціць цану дома і звернецца ў выканкам па выдзяленне зямельнага ўчастка.

Пераможцу аўкцыёну (адзінаму ўдзельніку) могуць даць растэрміноўку аплаты да трох гадоў без індэксацыі плацяжоў.

Калі на працягу месяца не будзе заявак на набыццё дома, кошт пачнуць паступова зніжаць: спачатку да 50 %, яшчэ праз месяц — да 80 % і 1 базавай велічыні ўключна.

Прэтэндэнт на куплю дома павінен прадставіць у выканкам:

— заяўку на куплю дома;

— копію дакумента, які сведчыць асобу грамадзяніна, без натарыяльнага засведчання;

— даверанасць, калі дакументы падае прадстаўнік;

— іншыя дакументы. Іх пералік прадстаўляецца для ўдзелу ў аўкцыёне.

Па выніках аўкцыёну або прамога продажу з пакупніком заключаецца дагавор куплі-продажу. Права ўласнасці на дом, набыты на падставе дагавора з выканкамам аб куплі-продажы, узнікае ў пакупніка з дня падпісання дагавора бакамі.

### Асаблівыя ўмовы

На працягу года з дня рэгістрацыі дагавора куплі-продажу неабходна пачаць рэканструкцыю, або капітальны рамонт дома, або знесці яго, калі дом аварыйны, разбураны ці пагражае абвалам. Пры гэтым можна спачатку зарэгістраваць свае правы на зямельны ўчастак, а на дом — пасля рэканструкцыі.

Былы ўладальнік дома мае права ў судовым парадку адмяніць рашэнне аб прызнанні дома безгаспадарным і перадачы яго ў дзяржуласнасць. Пры гэтым выканкам за кошт сродкаў бюджэту пакрые былому ўладальніку па яго патрабаванні цану прададзенага жылога дома і зямельнага ўчастка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Калумбіі на год уведзены надзвычайны рэжым



Прэзідэнт Калумбіі Густава Петра падпісаў указ аб увядзенні рэжыму надзвычайнай сітуацыі ў краіне тэрмінам на адзін год для ліквідацыі наступстваў згубнага ўплыву кліматычнага феномену Эль-Ніньё. Пра гэта паведаміла ТАСС са спасылкай на мясцовыя ўлады. Паводле інфармацыі, вымушаная мера дасць магчымасць выдзеліць дадатковыя сродкі з бюджэту, каб пераадолець наступствы стыхіі. У рэгіёне ўжо некалькі месяцаў фіксуецца анамальна спякотнае надвор'е. Як паведамляюць мясцовыя СМІ, у Калумбіі існуе выражаны рэжым надвор'я, дзе дажджы змяняюцца сухім надвор'ем. Аднак сёлета перыяд засухі зацягнуўся. З лістапада лясныя пажары ўжо знішчылі больш за 17 тысяч гектараў плошчаў па ўсёй краіне. З 31 пажару па ўсёй краіне толькі дзевяць знаходзяцца пад кантролем. На думку вучоных, на засуху аказаў уплыў незвычайна актыўны ў гэтым сезоне кліматычны феномен Эль-Ніньё.

### У Кітаі ўпершыню кланіравалі жывёл, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення

Навукоўцы ў Кітаі ўпершыню кланіравалі тыбецкіх кароў, якія знаходзяцца на мяжы вымірання, паведаміла «Жэньмінь жыбаа» анлайн». Гэтага ўдалося дасягнуць за кошт пераносу ядраў саматычных клетак. Гаворка ідзе аб двух відах кароў, якія жывуць на Тыбецкім сугор'і. Навуковы супрацоўнік даследчага інстытута жывёлагадоўлі і ветэрынарыі Кітайскай акадэміі сельскагаспадарчых навук Юй Давэй расказаў, што спецыялісты сабралі вушную тканку жывёл і ў лабараторыі стварылі лінію фібрабластаў. Пасля ім удалося атрымаць эмбрыёны клонаў з дапамогай тэхналогіі пераносу ядраў саматычных клетак. «Кланіраваныя эмбрыёны трансплантавалі ў сурагатных кароў, і пасля поўнага тэрміну цяжарнасці мы атрымалі восем кланіраваных цялят», — распавёў Юй Давэй. Ён дадаў, што ў будучыні вучоныя маюць намер спалучыць тэхналогіі кланіравання з традыцыйнымі механізмамі развядзення жывёл. Гэта дасць магчымасць сфарміраваць дасканалую генетычную сістэму і ўдасканаліць сістэмы абароны і выкарыстання рэсурсаў.

### У Іспаніі раскрылі злачынную сетку, якая займалася продажам цел памерлых

Іспанская паліцыя ліквідавала ў Валенсіі злачынную сетку, якая гандлявала целамі памерлых людзей. Аб гэтым паведамляецца на афіцыйным сайце Нацыянальнай паліцыі Іспаніі. Злачынцы падраблялі дакументы, каб мець магчымасць забіраць целы з бальніц і дамоў састарэлых, а пасля прадавалі іх універсітэтам для вывучэння па кошце 1,2 тысячы еўра за кожнае цела. Перавага аддавалася памерлым іншаземцам без сваякоў. Адзін з універсітэтаў заплаціў больш як 5 тысяч еўра за спаленне 11 цел пасля іх выкарыстання ў навуковых мэтах. Аднак ніводны з крэматорыяў у Валенсіі не мае інфармацыі аб гэтых крэмацыях. Расследаванне пачалося яшчэ ў пачатку мінулага года пасля таго, як паліцыі стала вядома, што цела памерлага чалавека было незаконна вывезена з морга бальніцы і перададзена ва ўніверсітэт на вывучэнне.

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Сяргею Фёдаравічу Алейніку, міністру замежных спраў, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокія спачуванні Сяргею Фёдаравічу Алейніку, міністру замежных спраў, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні міністру замежных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргею Фёдаравічу Алейніку ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні Сяргею Фёдаравічу Алейніку, міністру замежных спраў, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў смуткуюць у сувязі са смерцю былога начальніка Сакратарыята Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь АНЦІПЕНКІ Аляксандра Пятровіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

# ФОРМУЛА ПАСПЯХОВАГА ІНЖЫНЕРА

## Веды + матывацыя + інавацыйнае мысленне

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі стаў летась самай папулярнай ВНУ ў выпускнікоў Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. 65 абітурыентаў, якія засвоілі яго адукацыйныя праграмы, абралі месцам навучання вядучую ў краіне ВНУ па падрыхтоўцы спецыялістаў у вобласці інфармацыйных тэхналогій, радыётэхнікі і электронікі.**



Місіяй універсітэта абвешчана падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй і кадраў вышэйшай навуковай кваліфікацыі, здольных генерыраваць і ўвасабляць у жыццё інавацыйныя ідэі, ствараць канкурэнтаздольную навукаёмістую прадукцыю ў галіне інфарматыкі і электронікі. Дарэчы, БДУІР быў удастоены прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці па выніках 2011, 2016, 2019 і 2022 гадоў. У бягучым годзе ўніверсітэт адзначыць свой 60-гадовы юбілей.

### Прахадныя балы

Напрыканцы мінулага года БДУІР пацвердзіў свой статус вядучай установы вышэйшай адукацыі па падрыхтоўцы спецыялістаў у сферы інфарматыкі і радыёэлектронікі не толькі ў Беларусі, але і на прасторах СНД.

— Гэта адзін з паказчыкаў высокага ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў. У Год якасці мы яшчэ больш увагі будзем удзяляць адбору абітурыентаў і якасці падрыхтоўкі студэнтаў, — паабяцаў на Дні адкрытых дзвярэй **рэктар БДУІР Вадзім БОГУШ**. — Наш універсітэт уяўляе сабой буйны комплекс, які забяспечвае падрыхтоўку на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў Мінскім радыётэхнічным каледжы, падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй па праграмах агульнай вышэйшай, спецыяльнай вышэйшай і паглыбленай вышэйшай адукацыі ў магістратуры. У нас ёсць магчымасць працягнуць навучанне ў аспірантуры, дактарантуры з атрыманнем вучоных ступеняў кандыдата і доктара навук. Ну і, увогуле, рэалізаваць сябе не толькі ў распрацоўцы сучасных электронных інфармацыйных сістэм, але і ў навуковай дзейнасці, стварэнні новых прадуктаў і інавацыйных тэхналогій.

Дарэчы, летась для паступлення на бюджэтную форму навучання ў БДУІР 300 балаў было недастаткова. На платнай форме атрымання адукацыі таксама былі спецыяльнасці, дзе прахадныя балы складалі 305, 308, 320 і больш... Цікавасць з боку абітурыентаў да ВНУ — высокая, матывацыя — высокая і ўзровень падрыхтаванасці абітурыентаў — дастаткова высокі.

Сустрэча з кіраўнікамі ВНУ і членамі прыёмнай камісіі — абавязковы пункт у праграме кожнага Дня адкрытых дзвярэй. Яны, дарэчы, праводзяцца цягам навучальнага года некалькі разоў. Але чым бліжэй чарговая прыёмная кампанія, тым больш пытанняў узнікае ў патэнцыяльных абітурыентаў.

Так, маладых людзей, напрыклад, цікавіла, як можа паўплываць на прахадныя балы вяртанне ў тэсты заданняў пятага ўзроўню складанасці? Ёсць меркаванне, што сітуацыя можа быць непрадказальнай...

— Дазвольце з вамі не пагадзіцца. Хто добра вучыцца, той і сесію здае добра. Тое ж самае і ў школе. Прагназаваць прахадныя балы — справа няўдзячная. Кожны год складваецца свая ўнікальная канкурсная сітуацыя, у залежнасці ад якой фарміруюцца прахадныя балы, — падкрэсліў Вадзім Богуш. — Мы разлічваем на тое, што да нас прыйдуць матываваныя і таленавітыя абітурыенты. Вучыцца ў БДУІР вельмі няпроста, і, я спадзяюся, што гэта будзе сплаў добрых ведаў і працавітасці, якія дазволяць абітурыентам стаць студэнтамі, а пазней — адукаванымі і добрымі інжынерамі. Заўважу, што арыентавацца трэба не толькі на прахадныя балы, бо ў БДУІР практыкуецца агульнаўніверсітэцкі конкурс, які дазваляе пашырыць магчымасці абітурыентаў для паступлення, але трэба бліжэй пазнаёміцца і з факультэтамі, і са спецыяльнасцямі, таму што ёсць шэраг спецыяльнасцяў, якія маюць адметнасці пры фарміраванні конкурснай сітуацыі.

Трэба патлумачыць, што конкурс у БДУІР праводзіцца па групе факультэтаў і групе спецыяльнасцяў. Абітурыенты маюць магчымасць пры падачы заявы ў прыёмную камісію выбіраць і расстаўляць свае прыярытэты, падаць заяву на розныя факультэты на некалькі спецыяльнасцяў і ўдзельнічаць у конкурсе на падставе агульнага рэйтынгу, які выбудоўваецца па групе спецыяльнасцяў. Калі абітурыент не праходзіць па балах на першую ўпадабаную спецыяльнасць, згаданую ў прыярытэтах, то ўдзельнічае ў конкурсе на другую, трэцюю і гэтак далей.

Набор вядзецца па спецыяльнасцях, якія адносяцца да інжынернага профілю, і па двух спецыяльнасцях (гэта «Электронная эканоміка» і «Лічбавы маркетынг»), якія знаходзяцца на стыку сучасных інфармацыйных тэхналогій і метадаў, якія выкарыстоўваюцца ў цяперашні час у эканоміцы. На гэтыя спецыяльнасці трэба здаваць матэматыку, англійскую мову і адну з дзяржаўных моў. На інжынерныя спецыяльнасці — матэматыку, фізіку і адну з дзяржаўных моў.

Ёсць спецыяльнасці, востра запатрабаваныя эканомікай. На іх без уступных іспытаў будуць залічвацца ўладальнікі дыпломаў І, ІІ, ІІІ ступені трэцяга этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, школьныя медалісты і абітурыенты, якія маюць дыплом аб прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі з адзнакай.

Для выпускнікоў каледжаў прадугледжаны шэраг спецыяльнасцяў, па якіх можна атрымаць вышэйшую адукацыю ў скарочаны тэрмін у завочнай форме. Гэта, як правіла, людзі, якія ўжо працаўладкаваныя і адпаведна атрымліваюць больш высокі ўзровень кваліфікацыі.

### Асобная траекторыя

Абітурыентаў таксама цікавіў мэтавы набор.

Доўгатэрміновае планаванне развіцця рынку працы і, адпаведна, сістэмы падрыхтоўкі кадраў з вышэйшай адукацыяй — надзвычай складаная задача, лічыць Вадзім Богуш. Складаная перш за ўсё ў сувязі з тым, што тэхналагічная дынаміка ў інжынернай падрыхтоўцы вельмі высокая.

— Кожны год разам з заказчыкамі кадраў мы складаем пэўны прагноз па бюджэтных месцах. Бо кожны студэнт дзённай бюджэтнай формы навучання павінен атрымаць гарантаванае месца для накіравання на работу, — тлумачыць Вадзім Богуш. — Усё гэта робіцца для таго, каб дакладна разумець, як будзе змяняцца рынак працы, каб маладыя спецыялісты былі запатрабаваныя і занялі заслужанае месца ў эканоміцы Рэспублікі Беларусь.

Таксама мы звяртаем увагу будучага наймальніка на тое, што ён мае ўсе магчымасці для ўдзелу ў працэсе падрыхтоўкі студэнта і, атрымаўшы якаснага спецыяліста, павінен стварыць максімальныя ўмовы для яго прафесійнага росту. Развіццё мэтавай падрыхтоўкі, выкарыстанне бюджэтных магчымасцяў, праходжанне практыкі з'яўляюцца важнымі элементамі работы з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў.

Для таго каб абітурыент мог прэтэндаваць на мэтавае месца, павінна быць арганізацыя, якая пажадае яго бачыць у якасці мэтавіка. Для таго каб прыйсці на мэтавае месца, у яго павінен быць на руках дагавор, падпісаны паміж ім і гэтай арганізацыяй. Заказчыкі кадраў ужо пачынаюць працаваць са старшакласнікамі. Зацікаўленыя арганізацыі павінны будуць заявіць свой заказ на мэтавы набор, напрыклад, у Міністэрства прамысловасці, калі арганізацыя падпарадкаваная яму. А тое — у Міністэрства адукацыі. У красавіку Міністэрства адукацыі зацвярджае план мэтавага набору і даводзіць лічбы да ВНУ.



«Пры гэтым мэтавікі паступаюць па асобнай траекторыі, — заўважыў рэктар універсітэта. — Яны здаюць адзін унутраны іспыт па матэматыцы. Ён праводзіцца па ста пытаннях, якія ўжо вядомыя і размешчаны на сайце Міністэрства адукацыі. У экзаменацыйную камісію будуць уваходзіць і выкладчыкі ВНУ, і выкладчыкі са школ. Мэтавікі будуць залічвацца ў першую хвалю. Спачатку залічваюцца мэтавікі, бо ў адпаведнасці з правіламі прыёму, калі застаюцца незапоўненыя мэтавыя месцы, яны перадаюцца на агульны конкурс. Таму спачатку мэтавікі здаюць іспыты, затым праводзіцца конкурсны адбор і залічэнне. Пасля гэтага мы праводзім залічэнне па агульным конкурсе».

Асаблівасцю прыёму абітурыентаў на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі ў 2024 годзе з'яўляецца магчымасць паступлення па конкурсе сярод асобных арганізацый-заказчыкаў, калі конкурс па спецыяльнасці ў цэлым не адбыўся. Для абітурыентаў-мэтавікоў таксама ўводзіцца ніжні парог сярэдняга бала дакумента аб адукацыі, не ніжэйшы за 7 балаў (за выключэннем найбольш запатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў)».

«Якімі льготамі пры паступленні карыстаюцца пераможцы рэспубліканскай алімпіяды па астраноміі і школьныя медалісты?» — пацікавіліся ў Вадзіма Богуша.

— Астраномія і інфарматыка прыраўноўваюцца да фізікі, таму пераможцы рэспубліканскага этапу алімпіяд па гэтых прадметах могуць без экзаменаў паступаць на ўсе інжынерныя спецыяльнасці, дзе прадугледжана здача фізікі. Што датычыцца школьных медалістаў, уладальнікаў дыпломаў з адзнакай і ўладальнікаў дыпломаў І, ІІ і ІІІ ступені трэцяга (абласнога) этапу рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах, яны могуць без экзаменаў паступаць на востразапатрабаваныя эканомікай спецыяльнасці. Іх у нас пяць, — праінфармаваў рэктар БДУІР. — Дарэчы, цяпер прапрацоўваецца пытанне па пашырэнні пераліку такіх спецыяльнасцяў з улікам тых задач, якія стаяць па развіцці мікраэлектронікі і сферы радыётэхнікі і інфармацыйных тэхналогій у нашай краіне.

Асаблівая катэгорыя — гэта выпускнікі Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, якія маюць льготы пры паступленні на шэраг спецыяльнасцяў і паступаюць на іх без уступных іспытаў, па выніках сумоўя. Мэта сумоўя — ацаніць дзелавыя якасці, здольнасці, матывацыю і ўзровень падрыхтоўкі гэтай катэгорыі абітурыентаў. У нас ёсць студэнты, якія скарысталіся льготай у мінулым годзе, і яны пацвярджаюць свой высокі ўзровень падрыхтоўкі. Мы будзем рады, калі ўсе рэкамендаваныя Назіральным саветам тэхнапарка яго выхаванцы прыйдуць да нас, але рэкамендацый насамрэч даецца не так і шмат. У гэтым годзе пералік спецыяльнасцяў, на якія змогуць паступаць па выніках сумоўя выпускнікі тэхнапарка, якія маюць рэкамендацыю, пашырыцца.

### Як трапіць у студэнцкі інтэрнат?

Гэта традыцыйнае пытанне, якое задаюць на кожным Дні адкрытых дзвярэй...

— Усіх іншагародніх першакурснікаў і бюджэтнай, і платнай формы навучання, мы забяспечым месцам у інтэрнаце, — паабяцаў рэктар. — А далей ужо ўсё будзе залежаць ад вас. Ёсць рэйтынгі, якія ўлічваюць паспяховасць студэнта, яго ўдзел у грамадскім жыцці ўніверсітэта, навуковай дзейнасці... Зыходзячы з гэтага, пасля заканчэння першага курса вырашаецца пытанне з месцам у інтэрнаце на наступны навучальны год.

Восенню мінулага года ў Студэнцкай вёсцы быў уведзены ў эксплуатацыю яшчэ адзін дваццаціпавярховы студэнцкі інтэрнат БДУІР. Умовы пражывання там вельмі камфортныя. Блок — гэта фактычна двухпакаёвая кватэра з кухняй і санвузлом. На кухнях устаноўлены электрычныя пліты, халадзільнікі, ёсць кухонная мэбля, абедзенныя сталы з крэсламі. На жылых паверхах прадугледжаны таксама агульныя і дапаможныя памяшканні. У вестыбюльнай зоне першага паверха размешчаны буфет. У прыбудаванай частцы падвальнага паверха — трэнажорная зала, якая прызначана толькі для тых, хто пражывае ў інтэрнаце.

Пасля ўвядзення ў эксплуатацыю новага інтэрната з'явілася магчымасць забяспечыць месцам у інтэрнаце не толькі ўсіх першакурснікаў, але і амаль усіх старшакурснікаў з добрай паспяховасцю.

Транспартныя зносіны з вучэбнымі карпусамі БДУІР таксама добрыя. Да любога з іх можна дабрацца на метро. Улічваючы, што заняткі ў нас пачынаюцца цяпер не ў восем, а ў дзевяць гадзін раніцы, можна без праблем спланаваць свой ранішні час: прачнуцца, зрабіць зарадку, паснедаць і прыехаць на заняткі.

Пытанняў да кіраўніцтва ВНУ на Дні адкрытых дзвярэй заўсёды паступае шмат. На некаторыя з іх пакуль адказаць праблематычна. Таму што яшчэ не зацверджаны пералік востразапатрабаваных эканомікай спецыяльнасцяў, даты прыёмнай кампаніі, кантрольныя лічбы набору, невядомая колькасць мэтавых месцаў.

— Наша прыёмная камісія цяпер працуе ў штатным рэжыме. Да мая мы перавядзем яе на ўзмоцнены рэжым работы, будзем актыўна інфармацыйна падтрымліваць усіх нашых абітурыентаў, у тым ліку з выкарыстаннем сучасных тэхналогій. Ёсць сацыяльныя сеткі, чат-бот рэктарата, на сайце ўніверсітэта ёсць асобная ўкладка для абітурыентаў, ёсць «электронны абітурыент». І па меры таго як інфармацыя будзе абнаўляцца, яна будзе выкладвацца на адпаведных інфармацыйных рэсурсах, — паведаміў рэктар.

Звяртаючыся да патэнцыяльных абітурыентаў, Вадзім Богуш пажадаў ім паспяхова здаць выпускныя і ўступныя іспыты. І дадаў, што паступіць ва ўніверсітэт — гэта першая задача, а другая — не самая простая і не менш важная — гэта яго скончыць, бо сучасны ўзровень тэхналогій патрабуе пастаяннай работы над сабой. «Універсітэт, вядома ж, выбудоўвае працэс навучання так, каб студэнты ўжо з першага курса разумелі, што ў сучасным свеце заставацца спецыялістам — значыць пастаянна працаваць над сабой, пастаянна ўдасканальвацца ў сваёй галіне ведаў», — дадаў рэктар.

**Святлана ГЕРМАН.**

**Фота прэс-службы БДУІР.**

**Даведка:**

**Самыя высокі прахадныя балы ў 2023 годзе былі зафіксаваны ў БДУІР на спецыяльнасцях «Праграмная інжынерыя» (394), «Электронная эканоміка» (393). Недалёка ад іх размясціліся «Інфарматыка і тэхналогіі праграмавання» (391) і «Інфармацыйныя сістэмы і тэхналогіі» (389). На ўсе астатнія спецыяльнасці прахадны бал перавысіў 310.**

**А на спецыяльнасць «Электронныя сістэмы і тэхналогіі», якая трапіла ў пералік найбольш запатрабаваных эканомікай, зусім не было конкурсу, таму што на яе рэкамендавалі да залічэння пераможцаў рэспубліканскіх алімпіяд і медалістаў, што стала ўнікальным выпадкам у гісторыі ўступнай кампаніі ў БДУІР.**

Інклюзія

# Радасць простых рухаў

## Дорaць падапечныя тэрытарыяльнага цэнтра ў Добрушы тым, хто не дасканала валодае сваімі рукамі

**Сярод людзей, якія сутыкнуліся з праблемай аднаўлення і рэабілітацыі пасля траўм, інсульту і іншых захворванняў, сёння распаўсюджаны спецыяльныя трымальнікі-адаптары. Гэта прылады, якія дапамагаюць утрымліваць хвораму чалавеку прадметы ў руцэ, аднаўляць навык хвата рук. У Гомельскай вобласці, у Добрушы, вырабляць такія адаптыўныя сродкі для аблягчэння бытавой немачы навучыліся людзі, у якіх і свая жыццёвая гісторыя няпростая. Людзі з інваліднасцю — падапечныя тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Добрушскага раёна — далучыліся да праекта па друкаванні такіх адаптараў на 3D-прынтары.**



Спецыяліст па сацыяльнай рабоце тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Добрушскага раёна Кацярына БАНДАРЭНКА і падапечная цэнтра Марына АЛЕЙНІКАВА.

### ТРЫМАЦЦА І... ТРЫМАЦЬ

«Памятаю, як змагла пранесці ў руцэ шклянку з вадой...» Такой, здавалася б, простай, але для яе вельмі жаданай радасцю паўсядзённага жыцця дзеліцца жыхарка Добруша Наталля Паўлава. Нечакана для сябе жанчына першай пратэсціравала адаптыўныя сродкі для людзей з праблемамі хвата рук, вырабленыя ў добрушскім цэнтры.

— Спадабаліся трымальнікі для ручкі. Можна браць алоўкі каляровыя ці фламастары і маляваць. Спадабалася, што можна трымаць не толькі кружку за ручку, але і ўзяць у руку шклянку, — дадае жанчына.

Наталлі — 50 гадоў. Яна інвалід дзяцінства, нарадзілася са складанымі рухальнымі парушэннямі. Жыве жанчына з мамай — таксама інвалідам першай групы, якая перасоўваецца на калясцы. Наталля, нягледзячы на асаблівасці свайго здароўя, прылучылася шмат чаго рабіць самастойна па гаспадарцы. Кажа, што адаптыўныя сродкі дапамагаюць і стымулююць рухацца, выконваць пасільную работу дома.

— У мяне зусім дрэнна працуе левая рука, але я сама мыю посуд — толькі пластыкавы і металічны, вядома. Магу падмятаць і, калі мне дапамагчы адцiснуць анучу, мыю сама падлогу, — дзеліцца Наталля.

Акрамя яе, скарысталіся і пратэсціравалі адаптыўныя сродкі яшчэ некалькі інвалідаў дзяцінства з ДЦП — падапечныя аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Добрушскага раёна.

### РАЗУМНЫ ГАДЖЭТ У ДАПАМОГУ

3D-прынтар, на якім з'явілася магчымасць друкаваць гэтыя прыстасаванні, — падарунак установе ад Добрушскага райвыканкама. Так раённыя ўлады вырашылі падтрымаць калектыў супрацоўнікаў і падапечных цэнтра, якія з году ў год не спыняюцца і актыўна развіваюць самыя розныя віды творчай дзейнасці.

— Спыталі ў нас, што мы хацелі б. Папрасілі 3D-прынтар, бо марылі навучыцца працаваць з ім, але нават і не чакалі, што адразу нам будзе такі падарунак, — дзякуе ад усяго калектыву ўстановы **загадчык аддзяленнем сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Добрушскага раёна Наталля ПАХОМАВА.**

Дарэчы, збіралі прыладу і разбіраліся з ёй супрацоўнікі цалкам самастойна. Глядзелі відэаўрокі ў інтэрнэце, шукалі інфармацыю праз сацыяльныя сеткі, знайшлі ў Гомелі прыватныя фірмы, якія друкуюць вырабы на 3D-прынтары, і папрасілі іх праканстультаваць.

— Людзі адразу адгукнуліся. Мадэляў для друку, як аказалася, шмат у інтэрнэце. Друкавалі спачатку па тых праграмах, што знайшлі. Гэта быў разнастайны дэкор — сувеніры, навагоднія цацкі. Пасля загарэліся ідэяй рабіць нешта недарагое, але такое, што будзе карысна людзям з абмежаванымі магчымасцямі, — тлумачыць Наталля Віктараўна. — Мы бачылі ў крамах адаптыўныя прылады для людзей з ДЦП ці для тых, хто перанёс інсульт і мае праблемы з утрыманнем у руках прадметаў ужытку. Такія прылады на маркетплэйсах каштуюць больш за 20 рублёў за штуку. Мы захацелі рабіць на 3D-прынтары такія ж, але больш танныя па цане.





Мадэляў для друку адаптыўных сродкаў добрушскія энтузіясты не знайшлі ў інтэрнэце. Сярод калег у Беларусі спецыялісты тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Добрушскага раёна першыя, хто ўзяўся за такую дзейнасць. Таму і параіцца ў гэтай сітуацыі не было з кім. Кінулі кліч у сацыяльных сетках — папрасілі дапамогі ў тых, хто ўмее працаваць на 3D-прынтары.

— І людзі зноў адгукнуліся з радасцю. Распрацавалі для нас мадэлі адаптараў проста па нашых фотаздымках. Мы адказна падышлі да вывучэння друку менавіта адаптыўных сродкаў, бо важна выкарыстоўваць для такіх вырабаў бяспечны, нетаксічны пластык, — дадае Наталля Пахомава.

### ВУЧЫЦЦА РАЗАМ

Да працэсу друку падключыліся і падапечныя аддзялення сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў.

— Сярод нашых падапечных ёсць тыя, хто ўмее працаваць у Photoshop, увогуле на «ты» з камп'ютарам. Яны дапамагаюць нам у праектах, у тым ліку ў рабоце на 3D-прынтары. З задавальненнем шукаюць мадэлі для друку. Напрыклад, Міхаіл Базулька выдатна працуе ў Photoshop і на 3D-прынтары. Актыўныя ў рознай дзейнасці нашы падапечныя — сямейная пара Таццяна і Павел Максімавы. Дарэчы, пара шмат гадоў таму пазнаёмілася менавіта ў нас, — распавяла суразмоўніца.

Між тым асвоіць друк розных вырабаў на 3D-прынтары спецыялістам і падапечным цэнтра дапамог і вопыт іншых цікавых праектаў. У аддзяленні сацыяльнай рэабілітацыі, абілітацыі інвалідаў тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Добрушскага раёна, напрыклад, вельмі папулярны майстэрні па вырабе паліграфічнай прадукцыі, шыцці, рабоце з сублімацыйным прынтарам, тэрмапрэсам.

— Нас натхняе наш вопыт вырабу рэчаў з сублімацыяй. Гэта нанясенне малюнкаў на посуд, адзенне, сувеніры. Працуем з тэрмапрэсам і прынтарам, які запраўляецца адмысловымі сублімацыйнымі чарніламі. Самае складанае ў гэтай працы — зрабіць шаблон у фоташопе. Ён друкуецца на спецыяльнай сублімацыйнай паперы, а потым прыкладваецца да нарыхтоўкі ці ўласна вырабу, на які мы пераносім малюнак. Праца з тэрмапрэсам не складаная, але складана навучыцца працаваць у фоташопе. Цалкам самастойна нашы падапечныя не могуць гэты працэс пакуль выконваць, але разам са спецыялістам, інструктарам па працоўнай тэрапіі, у іх вельмі нядрэнна атрымліваецца, — кажа Наталля Пахомава.

Рэчы з сублімацыяй, вырабленыя ў цэнтры, карыстаюцца вялікім попытам у жыхароў Добруша і раёна. Набываюць іх і мясцовыя калектывы і арганізацыі. Каб дзяліцца інфармацыяй аб адаптыўных сродках, расказаць людзям пра такія прылады, якія аблегчаць іх жыццё, супрацоўнікі цэнтра і падапечныя зрабілі відэаагляд, як карыстацца адаптарамі. Перадалі інфармацыю ў дамы-інтэрнаты Гомельскай вобласці, Гомельскі абласны клінічны шпіталь інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. Адаптыўныя сродкі ўжо набылі і апрабавалі бацькі выхаванцаў Добрушскага раённага цэнтра карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі.

— Педагогі дзяліліся, што дзіця, у якога слабыя рукі, перажывае вельмі добрыя эмоцыі ад нават самых простых рухаў, якія пакараюцца, дзякуючы гэтым прыстасаванням, — дадала Наталля Віктараўна. — Звяртаем увагу і пажылых людзей, у якіх ёсць праблемы з хватам рук, што можна паспрабаваць выкарыстоўваць адаптары. Мы гатовы вырабляць адаптыўныя прыстасаванні пад заказ і высылаць. Для нашых падапечных, што ўдзельнічаюць у гэтым праекце, вельмі важна адчуваць сябе значнымі, ведаць, што яны могуць прыносіць карысць і дапамагчы камусьці.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Добрушскага раёна.**

# На работу — раненька

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Усё залежыць ад вытворчай неабходнасці, — гаворыць Кацярына. — Часам на ферму трэба прыходзіць у шэсць, а іншы раз дастаткова ў сем раніцы.

— У нас на ферме Барысы ўтрымліваецца 1600 галоў буйной рагатай жывёлы. І ўсе — цяляты, каровы, цялушкі — павінны быць здаровыя. Таму нашым клопатам з'яўляецца вакцынацыя, прафілактыка, лячэнне. Работы многа, — дапаўняе сястру Лізавета, — работа вельмі нялёгкая, але мы спраўляемся, прывыклі ўжо.

На працу ў філіял «Камароўка Агра» ААТ «Батчы» Брэсцкага раёна дзяўчаты прыйшлі ў маі мінулага года адразу пасля заканчэння аграрнага каледжа Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. Каледж знаходзіцца ў вёсцы Лужасна пад Віцебскам. Двайняткі, брастаўчанкі, гарадскія дзяўчынкі, якія не асабліва ўяўлялі сабе сельскае жыццё, паступілі туды пасля дзевяці класаў.

Мама іх, вядома, адразу спужалася, калі сёстры аб'явілі аб сваім рашэнні ехаць на вучобу. Стала адгаворваць, яно і не дзіва, дзяўчынкам толькі 15 гадоў было. Але ж потым расшылася адпусціць дачок, бо яны, па-першае, удзвюх, а па-другое, заўсёды былі адказныя, мэтанакіраваныя. Ну і вельмі любяць катоў, сабак, іншую жыўнасць. Лячылі дамашняга коціка, яшчэ калі малыя былі. Ужо потым, калі Кацярына і Лізавета будуць працаваць, а несвядомыя грамадзяне прынясуць і падкінуць на ферму двух кацянят, дзяўчаты адвязуць іх у Брэст, да бацькоў. І мама пагодзіцца да сваіх двух дамашніх катоў узяць яшчэ двух падкідышаў...

Ну а вучыліся ў каледжы яны вельмі стараннa і адказна, сведчанне таму — дыпломы з адзнакай. Вядома, маглі б з такімі дыпломамі адразу ў акадэмію паступаць, працягваць вучобу. Але Каця з Лізай былі на практыцы ў Брэсцкім раёне, па звычцы сваёй стараліся, іх заўважылі. Старэйшыя таварышы параілі пачаць з працоўнай дзейнасці, каб адчуваць сябе самастойнымі і заадно ўпэўніцца, што абраная спецыяльнасць — тое, што трэба, тое, што можа стаць справай жыцця. Так і зрабілі. Праўда, на практыцы яны былі ў «Мухаўцы» — прыгарадный гаспадарцы, толькі апошні месяц — у «Камароўцы», якая ад Брэста амаль за 60 кіламетраў. У апошняй і давялося працаваць. І як ва ўсіх працаўнікоў аграрнай галіны, у юных ветфельчараў адзін выхадны дзень. Але ж нічога, прызвычаіліся, усе справы ў Брэсце плануюць на гэты дзень і праводзяць яго актыўна, з карысцю. І на шопінг, і на сустрэчу з сябрамі часу хапае.

— Зарплата ў нас добрая, — дзеліцца Ліза і Каця. — Гэта, несумненна, станоўчы бок работы. Мы адчуваем сябе незалежнымі ў матэрыяльным плане. Жыллём нас забяспечылі, на дваіх выдзелілі пакой у двухпакаёвай кватэры з добрым рамонтам, наборам мэблі, бытавой тэхнікі. Адным словам, усё неабходнае для жыцця маем. Гатуем сабе самі, яшчэ падчас вучобы навучыліся.

Далей у планах двайнят — атрыманне вышэйшай адукацыі. Абедзве паступілі на завочнае аддзяленне ветэрынарнай акадэміі.



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

І літаральна праз тыдзень збіраюцца на сесію.

Тое, што з іх атрымаюцца добрыя ветурачы, упэўнена **галоўны ветэрынарны ўрач філіяла «Камароўка Агра» ААТ «Батчы» Вераніка МАЙСЕНЯ:**

— Дзяўчаты вельмі старанныя, адказныя, цікаўныя. Калі нечага не ведаюць, не саромеюцца лішні раз папытаць, удакладніць, зазірнуць у літаратуру на карысць справы. І яшчэ што цікава, у іх хутчэй, чым у іншых прайшоў перыяд адаптацыі. Ведаеце, у нас напачатку ўсе баяцца. Бо справу трэба мець не з кацянём альбо сабачкам, а з буйной рагатай жывёлай. Да яе не кожны з маладых супрацоўнікаў адразу наўпрост падыдзе, а тут яшчэ трэба разумець, што нясеш адказнасць за здароўе гэтай жывёліны. Словам, неабходна прывыкнуць, настроіцца. Ну і вядома, патрэбныя веды, навыкі, спагада да жывой істоты. Усё гэта ў маладых фельчараў ёсць. Таму ў свой час я сама ўгаворвала іх паспрабаваць сябе ў рабоце. І не памылілася.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Брэсцкі раён.*

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2024.Ч.002.00017** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** унитарное производственное предприятие «Глубокский мясокомбинат», 211800, Витебская область, г. Глубокое, ул. Московская, 81, тел. 8 (02156) 37408.

**Собственник:** открытое акционерное общество «Глубокский молочноконсервный комбинат».

**Организатор, Оператор электронной торговой площадке ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения торгов: 05.03.2024 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Капитальное строение с инв. № 235/С-321 площадью 1432 кв. м по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, г. Чашники, ул. Садовая, 50, наименование – магазин № 8, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности: подвал, вход в подвал, две пристройки, находящиеся на земельном участке с кадастровым № 225150100001000202 площадью 0,2526 га по адресу: Витебская обл., Чашникский р-н, г. Чашники, ул. Садовая, 50 (право постоянного пользования, доля 1/1).

**Нач. цена: 104 000,00 бел. руб. без учета НДС.**

**Задаток: 10 400,00 бел. руб.**

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу: https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 04.03.2024.**

**Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с: №** BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия электронных торгов.** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) рабочих дней с даты утверждения протокола электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; заключить договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 11 рабочих дней с даты утверждения протокола электронных торгов после возмещения затрат на организацию и проведение торгов; оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, указанные в договоре купли-продажи; оплатить НДС в размере 20 % сверх цены продажи предмета электронных торгов.

Расходы Продавца на проведение независимой оценки составляют 360,00 бел. руб. с учетом НДС. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: «Недвижимое имущество – торговые здания и помещения». Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Станкевич Денис Иванович, конт. тел. +375 29 898 76 83.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» *(Организатор аукциона)* по поручению **ОАО «Агро-Дубинское»** *(Продавец)* проводит открытый аукцион по продаже:

### Лот № 1: здание конюшни

**с инв. № 632/С-32162 общей площадью 128,2 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622083004301000085 (*право постоянного пользования*) площадью 0,0702 га по адресу: Воложинский район, Дорский с/с, д. Лужаны, д. 61а.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **5 700,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 570,00 бел. руб.
**Стоимость снижена на 50 %.**

### Лот № 2: здание кормоцеха

**с инв. № 632/С-32025 общей площадью 274,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622081700001000259 площадью 0,8064 га *(участок находится в зоне санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, право постоянного пользования)* по адресу: Воложинский район, Воложинский с/с, 31, 0,7 южнее д. Маршалки.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **34 954,35** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – 3 495,00 бел. руб.
**Стоимость снижена на 50 %.**

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB301210826001693 30000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение аукциона, по лоту № 1 в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 5 (пяти) процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 05.10.2023, 23.12.2023.

Аукцион состоится **21.02.2024** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **20.02.2024** до **17.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, (8029) 102-21-17, 516-80-64. Тел. для осмотра (8029) 376-87-46.**

УНН 600017962

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Ольса»

Аукцион состоится **06.03.2024 в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

**Лот № 1 – Легковой автомобиль SKODA SUPERB,** тип кузова – седан, кузов (рама) № TMBAB43T4C9048905, год выпуска – 2012, р/з 1459 ЕЕ-6.

Начальная цена продажи: 28 680,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 2 868,00 бел. руб.

Р/с для перечисления задатка BY85 BAPB 3012 7802 9001 0000 0000 в ОАО «Белагропромбанк» г. Минск, BIC BAPBBY2X. Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Код назначения платежа – 40901.

Срок подачи документов для участия в аукционе: по 05.03.2024 до 11.00. Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона gostorg.by.

**Доп. информацию можно получить по тел. 8029-624-26-25, Mogilev@ino.by**

## ОБЪЯВЛЕНИЕ

### ОАО «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ»

**извещает, что внеочередное общее собрание акционеров состоится 13 февраля 2024 года по адресу: г. Минск, ул. Фабрициуса, 2.**

Начало собрания – в 14.00. Регистрация акционеров – с 13.30 до 13.55. При себе иметь документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении передаточного акта в связи с реорганизацией открытого акционерного общества «МИНСКОБЛХЛЕБОПРОДУКТ» в форме присоединения к нему открытого акционерного общества «Борисовский мясокомбинат № 1».

*Наблюдательный совет ОАО «Минскоблхлебопродукт», тел. 282-57-57.*

УНП 600013173

## Информация о формировании реестра владельцев ценных бумаг

Полное наименование и местонахождение акционерного общества: открытое акционерное общество «Лукомльэнергомонтаж», 211162, г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, Витебская область, Чашникский район.

Наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров: Наблюдательный совет, 31 января 2024 года.

Дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров: 01 марта 2024 года.

УНП 300007839

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже пустующего жилого дома в частную собственность в д. Осинцы, д. б/н Крайского сельсовета Логойского района Минской области

УНП 600537220

| | |
|---|---|
| **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| **Наименование предмета аукциона** | Жилой дом |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **6 марта 2024 года в 15.00, аг. Крайск, ул. Буденного, д. 8, Крайский сельисполком, зал заседаний** |
| **Продавец и его адрес, телефоны** | Крайский сельский исполнительный комитет, 223138, Минская область, Логойский район, аг. Крайск, ул. Буденного, д. 8 тел.: 1774-73-6 35; 1774-73-6-36; А1 44 5990948 |
| **Местонахождение имущества** | Минская область, Логойский район, д. Осинцы, д. б/н |
| **Общая площадь жилых помещений** | 36,0 кв. м |
| **Описание имущества** | Одноэтажный, одноквартирный жилой дом, бревенчатый, материал крыши – шифер, отопление печное. Водопровод, канализация отсутствуют. Газоснабжение – баллонное. Электроснабжение центральное. Имеются хозяйственные постройки. Не зарегистрирован |
| **Условия аукциона по продаже пустующих домовладений** | Возместить затраты, связанные с подготовкой и проведением аукциона, расходы по публикации извещения в средствах массовой информации в соответствии с актом выполненных работ в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона |
| **Начальная цена предмета аукциона, бел. рублей** | 40,00 |
| **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 20 % от начальной (стартовой) цены жилого дома, **8,00 руб.** Получатель – Крайский сельисполком, BY56AKBB36006190811060000000, в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, БИК AKBBBY2X, УНП 600537220, код платежа 04707 |
| **Адрес земельного участка** | Минская область, Логойский район, д. Осинцы, д. б/н |
| **Площадь земельного участка** | Не зарегистрирован |
| **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| **Дата начала приема документов** | С даты объявления аукциона |
| **Окончательный срок приема документов** | 29 февраля 2024 года до 17.00 |

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами», с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23 сентября 2021 года № 547 «О реализации Указа Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116», на основании решения Минского областного исполнительного комитета от 27 сентября 2021 года № 844 п.1, на основании решения Крайского сельского исполнительного комитета.

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также юридические лица, если иное не установлено законодательными актами и международными договорами Республики Беларусь.

Для участия в аукционе представляются:
- заявление на участие в аукционе по установленной форме, к которому прилагаются следующие документы:
- копия платежного поручения о внесении суммы задатка;
- гражданин предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- представитель гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенную доверенность, документ, удостоверяющий личность;

При подаче документов на участие в аукционе заключается СОГЛАШЕНИЕ о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона с Крайским сельским исполнительным комитетом.

Осмотр пустующего дома осуществляется претендентом на участие в аукционе в сопровождении члена комиссии по организации и проведению аукциона в любое согласованное ими время в течение установленного срока приема заявлений.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему пустующего дома в частную собственность с внесением платы за пустующий дом в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, **обязан:**

в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся:
- возместить затраты за организацию и проведение аукциона, внести плату за предмет аукциона.
- подать заявление о предоставлении земельного участка.

После принятия соответствующего решения обратиться в Логойское бюро РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка и предмета аукциона, а в случае предоставления земельного участка на праве аренды – заключить договор аренды земельного участка и обратиться за его государственной регистрацией.

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «ГомельГрааль»

| Лот | Наименование Лота | Местонахождение | Начальная стоимость с учетом НДС 20 %, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 350/С-196429 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание административно-хозяйственное, общая площадь – 1901,1 кв. м) | Гомельская обл., г. Гомель, ул. Пригородная, 31 | 779 760,00 | 77 976,00 | 38 988,00 |
| Лот расположен на земельном участке с кадастровым № 340100000003003302, площадью 1,8006 га, назначение – для эксплуатации и обслуживания зданий и сооружений. Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании: расположен в водоохранных зонах рек и водоемов на площади 1,8006 га (код 2,4). Право постоянного пользования | | | | | |
| В отношении лота проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 245 (300975) от 19.12.2023, стр. 7 | | | | | |
| В отношении лота имеются ограничения (обременения): заключенный договор аренды и залог (залогодержатель – ОАО «ТрестБелстромремонт»). Подробная информация по обременению – по тел. +375447584099 (Ольга Александровна) | | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **20 февраля 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127** | | | | |
| **Срок приема заявлений и оплаты задатка** | **с 10.00 05.02.2024 до 16.00 16.02.2024 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** | | | | |

**Условия для участия в торгах:**

1. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту 1, ООО «ГомельГрааль», проводимых 20.02.2024.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д.1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи.

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете «Звязда») на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста: 5 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 14 (четырнадцати) календарных дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона.

6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. **По вопросу осмотра объектов обращаться к Дмитрию (+375336123939). Дополнительная информация по предмету торгов по тел. +375293082897, Анаида.**

7. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании действующего законодательства Республики Беларусь.

8. Государственная регистрация договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ООО «ГомельГрааль», УНП 491328786 (246010, г. Гомель, ул. Пригородная, 31) в лице директора Цаповой Светланы Васильевны, тел. +375336123939** |

# «ІНВЕСТЫЦЫІ» Ў ЧУЖУЮ КІШЭНЮ

## Ад дзейнасці міжнароднай злачыннай групы пацярпела больш за 5 тысяч чалавек



**«Наша ўпраўленне атрымала аператыўную інфармацыю аб тым, што на тэрыторыі Мінска дзейнічае арганізаваная група, якая займаецца махлярскімі дзеяннямі ў дачыненні да грамадзян, а таксама здзяйсняе крадзяжы грашовых сродкаў з банкаўскіх карт-рахункаў грамадзян на падставе ўдзелу ў гандлі на сыравінных рынках, рынках крыптавалюты і фондавым рынку. Гэтая інфармацыя пацвердзілася падчас аператыўных мерапрыемстваў», — заявіў начальнік галоўнага ўпраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй МУС Андрэй АНАНЕНКА. Ён адзначыў, што быў праведзены шырокі комплекс мерапрыемстваў, прадугледжаны Законам аб аператыўна-вышуковай дзейнасці.**

### «Капаць» пачалі ў Мінску — выявіўся цэлы махлярскі «мурашнік»

«Пры правядзенні аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў была задакументаваная супрацьпраўная дзейнасць. Было таксама ўстаноўлена, што група мае не менш як пяць офісаў на тэрыторыі Мінска, у кожным з якіх працавалі ад 10 да 20 чалавек, — падкрэсліў Андрэй Ананенка. — Больш за тры гады гэтая група дзейнічала на тэрыторыі сталіцы».

ГУБАЗіК працаваў ва ўзаемадзеянні з падраздзяленнямі Следчага камітэта Беларусі. «На тэрыторыі Беларусі намі сумесна былі затрыманыя больш за 50 удзельнікаў гэтай злачыннай схемы. У членаў арганізаванай групы канфіскавалі камп'ютарную тэхніку, бухгалтарскую дакументацыю, электронныя носьбіты, больш за 200 тысяч долараў у эквіваленце і 12 дарагіх аўтамабіляў на прыкладна такую ж суму», — падсумаваў Андрэй Ананенка.

### Злачынцы сплялі складанае павуціннe пад кодавай назвай «Кераміка» на тэрыторыях розных краін

Як адзначыў **начальнік галоўнага ўпраўлення лічбавага развіцця папярэдняга следства цэнтральнага апарата Следчага камітэта Андрэй МАТОЛЬКА,** у выніку гэтых дзеянняў была ўзбуджаная і расследуецца крымінальная справа па злачынстве, прадугледжаным ч. 4 арт. 209 КК па факце здзяйснення на працягу больш за тры гады на тэрыторыі Беларусі, Расіі і іншых дзяржаў махлярства ў асабліва буйным памеры. Злачынства было здзейснена міжнароднай арганізаванай групай, чые офісы ў выглядзе кол-цэнтраў размяшчаліся ў Мінску, Маскве і гарадах іншых краін.

«Для ўтойвання ашуканскіх дзеянняў кол-цэнтраў (цэнтраў апрацоўкі званкоў) на тэрыторыі Мінска арганізатары злачыннай дзейнасці зарэгістравалі не менш за шэсць юрыдычных асоб. Іх відамі дзейнасці былі стварэнне рэкламы, дзейнасць тэлефонных даведачна-інфармацыйных службаў, аптовы гандаль вырабамі з керамікі і шкла, мыйнымі сродкамі, а таксама іншыя віды паслуг па клінінгу. Для ажыццяўлення нібыта законнай прадпрымальніцкай дзейнасці суб'екты гаспадарання арандавалі офісы», — распавёў Андрэй Матолька.

Фактычна ў арандаваных юрыдычнымі асобамі офісных памяшканнях ажыццяўлялася дзейнасць па завалоданні шляхам падману грашыма грамадзян Беларусі і Расіі. Ужо сёння следства ўстанавіла больш за 5 тысяч пацярпелых, сума нанесенай шкоды якім вылічваецца ў асабліва буйным памеры.

«Па непасрэдна ўзніклым падазрэнні затрымана больш за 50 удзельнікаў арганізаванай групы, сярод іх грамадзяне Беларусі, Расіі і Украіны. З санкцыі пракурора ў месцах фактычнага пражывання затрыманых, а таксама ў пяці офісных памяшканнях у Мінску правялі вобыскі. У выніку выяўлена і канфіскавана камп'ютарная тэхніка і іншыя носьбіты інфармацыі, грашовыя сродкі ў буйным памеры, а таксама дарагія аўтамабілі, якія знаходзіліся ў распараджэнні падазраваных. У аднаго з фігурантаў дома пры вобыску канфіскавана рэчыва расліннага паходжання, па якім цяпер праводзяцца даследаванні на прадмет наяўнасці ў ім наркатычных сродкаў», — адзначыў Андрэй Матолька.

З удзелам адвакатаў затрыманыя дапытаныя ў якасці падазраваных. На допытах практычна ўсе фігуранты далі паказанні ў прызнанні сваёй віны і распавялі пра абставіны здзяйснення сваіх ашуканскіх дзеянняў, пра ролю і сваім удзеле ў дзейнасці так званых кол-цэнтраў. У дачыненні да 48 падазраваных з санкцыі пракурора прыменена мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту, ім прад'яўлена абвінавачванне ў махлярстве, якое ўчынена арганізаванай групай у асабліва буйным памеры. У мэтах забеспячэння кампенсацыі шкоды на ўстаноўленую маёмасць абвінавачаных у выглядзе грашовых сродкаў, рознай тэхнікі і нерухомасці накладзены арышт.

### Тэхналогія падману

Паводле слоў Андрэя Матолькі, злачынцы стварылі і размясцілі ў сетцы Інтэрнэт розныя рэсурсы з ілжывай інфармацыяй аб магчымасці атрымання высокага даходу, якая прадастаўляецца грамадзянам за кошт інвеставання ў дзейнасць фінансавых кампаній або гандлю на біржы. Пры зваротах людзей да гэтых рэсурсаў наведвальнікамі запаўняліся спецыяльныя анкеты ў электроннай форме, пасля чаго з імі звязваліся ўдзельнікі арганізаванай групы, так званыя работнікі фінансавых кампаній. Зламыснікі выкарыстоўвалі ў размовах выдуманыя імёны і прозвішчы-псеўданімы. У матэрыялах крымінальнай справы маюцца звесткі пра больш чым 1,5 тысячы псеўданімаў, якія выкарыстоўваліся ў злачыннай дзейнасці.

Падчас размовы ашуканцы пераконвалі пацярпелых перавесці грашовыя сродкі на дэпазітныя рахункі, якія яны зарэгістравалі на нібыта сапраўдных інфармацыйных рэсурсах фінансавых кампаній. Пералічаныя пацярпелымі грошы выкрадаліся, а на фіктыўна створаных інтэрнэт-пляцоўках рабіліся бачнасць паспяховага гандлю і імітацыя росту нейкага прыбытку.

«Пры спробе пацярпелым вываду такога неіснавальнага даходу з абароту злачынцы пераконвалі сваіх ахвяр у немэтазгоднасці такіх дзеянняў і неабходнасці далейшага інвеставання. Яны таксама маглі выкарыстоўваць падставу аб узніклых складанасцях у банкаўскай сферы з прычыны геапалітычнай сітуацыі альбо проста зніклі і пераставалі выходзіць на сувязь», — дадаў Андрэй Матолька.

У асобных выпадках з пацярпелымі працягвалі кантактаваць тыя ж ашуканцы, але ўжо прадстаўляючыся юрыстамі кампаній або банкаўскімі супрацоўнікамі, якія нібыта ажыццяўляюць дзейнасць па пошуку нядобрасумленных брокераў і дапамагаюць вярнуць раней пералічаныя грошы. «На самай жа справе пад рознымі падставамі яны схілялі і змушалі падманутых пацярпелых зноў пералічваць грашовыя сродкі на падкантрольныя злачынцам рахункі, якія ў чарговы раз у іх выкрадалі», — расказаў Андрэй Матолька.

У злачыннай групоўцы была выразна выбудаваная іерархія. Ніжэйшае звяно складалі так званыя скулы і сейлсы, у іх задачы ўваходзіў пошук патэнцыяльных пацярпелых — грамадзян, якія павінны былі пералічыць ашуканцам грашовыя сродкі. Задачай гэтай касты зламыснікаў было ўцягнуць патэнцыяльных ахвяр у схему афёры. На наступнай прыступцы іерархіі размяшчаўся retention-аддзел (другаснае суправаджэнне). Яго прадстаўнікі працавалі на фірму ўжо досыць працяглы час, валодалі неабходнымі навыкамі: добра ведалі банкаўскую справу, фінансавы інструментарый і іншыя разумныя словы.

— Калі патэнцыяльны пацярпелы настойваў на афармленні супрацоўніцтва ў выглядзе дагавора, ніякіх праблем у гэтай частцы не ўзнікала. Для рэалізацыі такога роду задач у злачыннай групоўцы існаваў compliance-аддзел. Яго прадстаўнікі займаліся складаннем падробленых брокерскіх дакументаў, дагавораў з грамадзянамі і многае іншае, — распавёў Андрэй Ананенка.

Акрамя гэтага, у так званай кампаніі існаваў IR-аддзел, які спецыялізаваўся на падборы кандыдатаў на нелегальную працу.

Для таго каб «стрэсці» з даверлівых грамадзян пабольш грошай, часам зламыснікі выкарыстоўвалі такую схему, як невялікае вяртанне. Напрыклад, ашуканцы прасілі ахвяру пералічыць на дропаўскі рахунак 250 долараў, а далей, прыблізна праз пару дзён, маглі перавесці ёй 30-50 долараў у якасці «заробку». Маўляў, усяго плюс-мінус за суткі вы ўжо змаглі зарабіць такую суму, уяўляеце, што будзе далей...

Для таго каб заблытаць сваіх ахвяр, як гаворыцца, схаваць канцы ў ваду, ашуканцы здзяйснялі злачынствы не ў краіне сваёй дыслакацыі. Гэта значыць беларускія «офісы» не тэлефанавалі жыхарам нашай краіны, а працавалі з ахвярамі з Расіі, Казахстана і Украіны. Такая ж схема выкарыстоўвалася і ў іншых дзяржавах. Фактычна кожны год офісы, якія займала злачынная групоўка, мяняліся — з боку зламыснікаў схема была досыць прадуманай, а меры канспірацыі — на ўзроўні.

### У Маскве не схаваешся

Адначасова Упраўленнем па арганізацыі барацьбы з супрацьпраўным выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій МУС Расіі былі праведзены аналагічныя мерапрыемствы ў Маскве, дзе паліцэйскія затрымалі аднаго з арганізатараў гэтай міжнароднай групы. Па яго месцы жыхарства выяўлена і канфіскавана больш за 30 мільёнаў расійскіх рублёў.

Дакладную суму шкоды яшчэ трэба высветліць. Аднак у мэтах пакрыцця страт на маёмасць абвінавачаных (грошы, розную тэхніку і нерухомасць) накладзены арышт. Дарэчы, сярэдні ўзрост пацярпелых па крымінальнай справе складае 50-60 гадоў, а самай старэйшай — 75. Гэта простыя людзі, якія вырашылі самастойна павялічыць свае зберажэнні якімсьці загадкава сучасным спосабам. Сярод іх кухцёры, грузчыкі, вадзіцелі, рабочыя на вытворчасцях і нават супрацоўнікі бюджэтнай сферы. Але — ніводнага прадпрымальніка.

### Як не трэба рабіць

Убачыўшы ў сетцы тэматычную рэкламу, 75-гадовая жыхарка Віцебскай вобласці захацела інвеставаць усе свае асабістыя зберажэнні, уклаўшы іх у «эканамічны праект». На працягу трох месяцаў яна камунікавала са зламыснікамі (нібыта прадстаўнікамі кампаніі), якія пераконвалі яе ў мэтазгоднасці шматразовых капіталаўкладанняў.

— Жанчына адразу пералічыла на іх рахунак усю суму, якая была ў яе. Аднак пасля гэтага ўнёску ашуканцы прапанавалі ёй набыць акцыі ўжо іншай кампаніі. Але фінансаў у пацярпелай не засталося, таму яна пазычыла грошы ў знаёмых. Далей ад зламыснікаў прыйшло паведамленне пра іншую «не менш выгадную прапанову» — яе пераконвалі ў тым, што суму, якая нібыта ляжыць на дэпазітным рахунку жанчыны, неабходна павялічыць, — расказаў Андрэй Матолька.

Даведаўшыся пра тое, што пацярпелай банальна няма ў каго ўзяць грошы, ашуканцы паведамілі, што іх фінансавая кампанія гатовая пазычыць ёй 7,5 тысячы долараў. Пасля «работнікі арганізацыі» запатрабавалі гэтую суму вярнуць, па гэтай прычыне пацярпелая была вымушаная звярнуцца ў банк па крэдыт.

У агульнай складанасці шляхам розных хітраспляценняў, дамоўленасцяў, схем махлярства аферысты пазбавілі бабулю сумы больш за 18 тысяч рублёў.

### У гэтым годзе істотна змянілася структура кіберзлачынстваў

Пра гэта паведаміў **начальнік Галоўнага ўпраўлення па супрацьдзеянні кіберзлачыннасці МУС Андрэй КАВАЛЁЎ.**

«Ухіл — у бок махлярстваў, звязаных з добраахвотнай перадачай ахвярамі сваіх зберажэнняў», — паведаміў ён. У цэлым «махлярствы складаюць ужо больш за 55 % ад усіх кіберзлачынстваў», пры гэтым «удзельная вага крадзяжоў шляхам мадыфікацыі камп'ютарнай інфармацыі знізілася да 30 %».

У большасці выпадкаў ашуканцы маюць зносіны са сваімі ахвярамі ў месенджарах, «з адрывам лідзіруе Telegram, далей ідуць Viber і WhatsApp. Акрамя гэтага, злачынцы актыўна выкарыстоўваюць сацыяльную сетку «ВКонтакте».

Па словах прадстаўніка МУС, сярод спосабаў кібермахлярстваў пераважае продаж неіснуючага тавару на розных інтэрнэт-рэсурсах, падман грамадзян пад падставай укладання сродкаў у крыптавалюту альбо здзелак з ёй на неіснуючых біржах. Актуальнымі застаюцца званкі пад выглядам супрацоўнікаў праваахоўных органаў альбо банкаў.

Нярэдка зламыснікі выступаюць у ролі знаёмых пацярпелых, «узламаўшы іх уліковыя запісы ў сацыяльных сетках альбо месенджарах, просяць пазычыць грошы. Часцяком для ажыццяўлення падобных схем ствараюцца старонкі-клоны».

### Механізм вяртання грошай запрацуе праз месяц

Андрэй Кавалёў патлумачыў, як міліцыя ва ўзаемадзеянні з Нацбанкам змогуць «у фармаце 24/7» блакіраваць банкаўскія аперацыі беларусаў, якія, як мяркуецца, сталі ахвярамі махляроў. Паводле звестак МУС, гэты механізм запрацуе ўжо 1 сакавіка.

Па словах Андрэя Кавалёва, новы механізм распрацоўваўся Міністэрствам унутраных спраў сумесна са Следчым камітэтам на працягу апошніх пяці гадоў. У выніку была выпрацавана сістэма ўзаемадзеяння праваахоўных органаў з Нацыянальным банкам і ўсімі банкаўскімі арганізацыямі краіны, якая дазваляе аператыўна рэагаваць на «махлярскія інцыдэнты».

Калі грамадзянін стане ахвярай махляроў і як мага хутчэй звернецца ў міліцыю, Следчы камітэт або банкаўскія органы, то максімальна хутка будуць улічаны ўсе лічбавыя сляды. Ва ўсе банкі будзе накіраваны пэўны запыт. Іншымі словамі, калі ахвяра максімальна хутка паведаміць аб злачынстве, то ў спецыялістаў з'явіцца магчымасць блакіравання грашовых сродкаў на тэрыторыі краіны.

Андрэй Кавалёў таксама запэўніў, што пасля таго як запрацуе новая сістэма, у ахвяр махляроў з'явіцца больш шанцаў вярнуць страчаныя грошы. У МУС таксама выказалі надзею на тое, што новая практыка дазволіць зрабіць Беларусь «нецікавай для ашуканцаў», паколькі яны страцяць магчымасць свабодна выводзіць грошы, якія яны выманілі ў беларусаў, у іншыя краіны.

«На тэхнічным узроўні мы ствараем пэўны бар'ер, каб злачынцам было некамфортна тут «працаваць», — растлумачыў прадстаўнік МУС.

Нагадаем, што Нацыянальны банк Беларусі дазволіў арганізацыям, якія ажыццяўляюць грашовыя пераводы нашых грамадзян, блакіраваць іх у асобных выпадках сваёй пастановай № 453 ад 15 снежня 2023 года. Сярод прычын такой блакіроўкі пераводу ў Нацбанку назвалі прыкметы, што тыя ажыццяўляюцца без згоды карыстальніка плацежнай паслугі, што ў гэтым банку краіны назвалі «несанкцыянаваным пераводам».

Сяргей КУРКАЧ.

# АДНА КУРЫЦА ДАРАЖЭЙШАЯ ЗА ПУД СЛІЎ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Дарэчы, нягледзячы на статуснасць установы, запісацца ў Прэзідэнцкую бібліятэку можа любы ахвотны, запоўніў сурпацоўнікі. І, у адрозненне ад іншых бібліятэк, а таксама музеяў, тут старыя выданні вам дадуць патрымаць у руках і пагартаць. Профіль бібліятэкі: эканоміка, палітыка, права і дзяржаўнае кіраванне. Акрамя стараадаўніх фаліянтаў, у аддзеле рэдкіх выданняў сабраны ўнікальныя падборкі перыёдыкі і рознага кшталту брашур савецкага перыяду беларускай гісторыі, у тым ліку са змяшчэннем аглядаў цэн на світанку станаўлення БССР.

У 1920-я пры Інстытуце беларускай культуры (знакамітым Інбелкульце — папярэдніку Нацыянальнай акадэміі навук) актыўна працавала «Цэнтральнае бюро краязнаўства». Адным з кірункаў яго даследаванняў было вывучэнне і апісанне розных бакоў жыцця беларускіх рэгіёнаў — ад этнаграфіі да эканомікі. Першым даследаваннем стала «Апісанне Горацкага раёна», наступным — «Асіповіцкі раён». У прадмове да брашуры сказана, што мэта выдання — «даць масаваму краязнаўцу пэўны матэрыял аб адным з раёнаў Беларусі ў сістэматызацыі і апрацоўцы». Выданне дажыло да нашых дзён. Цікава, што штамп на брашуры — «Азербайджанская цэнтральная бібліятэка».

— Пасля Вялікай Айчыннай вайны фонды беларускіх бібліятэк фарміраваліся з розных крыніц. Наша бібліятэка не выключэнне — яна не была вывезена, і многія кнігі «загінулі» ў агні вайны, — расказвае **загадчыца аддзела стрдрукаваных і рэдкіх кніг Прэзідэнцкай бібліятэкі Святлана ПАЎЛАВІЦКАЯ.** — Камплектатары нашай бібліятэкі (тады яна называлася Урадавая бібліятэка імя Горкага) прыклалі максімум намаганняў, каб адшукаць беларускія выданні ў бібліятэках гарадоў Савецкага Саюза. Таму на многіх выданнях нашага аддзела, якія ўбачылі свет да 1940 года, штампы бібліятэк Баку, Тбілісі, Ленінграда, Масквы і іншых гарадоў.

## На рынак у Асіповічы

Дык вось, у брашуры Інбелкульта «Асіповіцкі раён», у артыкуле аб эканоміцы рэгіёна, ёсць вялікая табліца цэн на Асіповіцкім рынку — адным з найбуйнейшых на той момант у краіне — за 1928 год — з дэталізацыяй па месяцах і канкрэтнымі вёскамі, адкуль прывезены тавар. Зразумела, што ў тыя часы інтарэсы і запыты гарадскога і сельскага пакупніка адрозніваліся значна мацней, чым у XXI стагоддзі, і наша маленькае даследаванне не прэтэндуе на стварэнне нейкай аб'ектыўнай карціны. Але ўсё ж адважымся выказаць здагадку, што і сто гадоў таму, як і ў нашы дні, за самымі свежымі і, як цяпер прынята казаць, «экалагічнымі» прадуктамі любы спажывец адпраўляўся на рынак. Давайце паглядзім, што і пачым прапанаваў Асіповіцкі рынак сваім наведвальнікам.

Напрыклад, ржаная мука каштавала 1 рубель 60-65 капеек за пуд у студзені і 1 рубель 80 капеек у жніўні. Грэчка з'явілася ў продажы толькі ў ліпені (са студзеня яе ў асартыменце не было), і прасілі за пуд 1 рубель 70. Да лістапада, у адрозненне ад мукі, яна таннела — ужо каштавала 1,6-1,65 рубля. Цікава, што крупы і муку на рынку, мабыць, закуплялі оптам — цэны прадстаўлены адразу ў пудах, а пуд — гэта 16,38 кг. Гарох таксама прадавалі пудамі, і каштаваў пуд 1,2-1,45 капейкі па рынку. Найбольш танным гарнірам, як вынікае з табліцы, была бульба — у студзені яна каштавала 35 капеек за пуд, да сакавіка кошт паднімаўся да 40 капеек за той жа аб'ём, але да лістапада вяртаўся да ранейшага ўзроўню — 30-35 капеек. Прычым бульба на рынку была прадстаўлена ўвесь год, у адрозненне, напрыклад, ад грэчкі.

А вось буракі прадавалі фунтамі (1 фунт = 453 г). Такім чынам, каштавала амаль паўкіло буракоў на рынку ў Асіповічах у 1928 годзе 3 капейкі, а да жніўня кошт падаў да 2 капеек. Рэпчатую цыбулю прадавалі даражэй — 10 капеек за фунт. Яблыкі таксама прадавалі фунтамі — ад 4 да 7 капеек у студзені (сушаныя — аж 15 капеек за фунт). Да жніўня кошт чакана знізіўся, а прапанова павялічвалася (паведамляецца, што ў ліпені на рынак прывезена 2 вазы яблыкаў, і каштаваць «вітаміны» новага ўраджаю сталі 3-5 капеек за фунт). Мёд у сезон каштаваў 40 капеек за фунт, морква — 1,15 рубля за пуд.

Грыбы ў 1928 годзе былі дарагімі, як, зрэшты, і ў нашы дні. За сушаныя баравікі ў маі прасілі 50 капеек за фунт. Свежых грыбоў не прапаноўвалася і ўвосень: хочаш пасмажыць — збірай сам. Ды і сушаныя — не на кожным прылаўку. У кастрычніку на ўвесь рынак іх было ўсяго 3 фунты, а кошт даходзіў нават да 80 капеек за фунт. Журавіны прадаўцы лічылі квартамі (0,94 кг), то-бок у бліжэйшай сучаснаму пакупніку «вагавой катэгорыі» (у сярэднім 10 капеек па рынку ў сезон). За чарніцы ў ліпені прасілі 5 капеек за кварту. Капуста прадавалася па 6 капеек за фунт. Агуркі новага ўраджаю ў ліпені каштавалі 8-10 капеек дзясятак (аказваецца, іх прадавалі за дзясяткамі, як яйкі). Грушы былі таннейшыя: 5-8 капеек за фунт летам, а восенню 2 рублі — пуд.



Вішню прадаваць пачыналі ў ліпені і заканчвалі ў жніўні. Кошт не мяняўся — 20 капеек за фунт. А вось буякі былі таннымі: 4 капейкі за кварту. Як і сёння, дастаткова дарагі (у параўнанні з цыбуляй) быў часнок: у сакавіку — 40 капеек за фунт, і да канца года больш яго на рынак не прывозілі. Затое слівы прадаваліся пудамі: 1,2 рубля за пуд у сезон. Гарбузовыя семачкі лічылі шклянкамі — 5 капеек за шклянку. Была прадстаўлена летам на рынку і зяляніна (салата): 7-8 капеек за фунт.

## Дарагая «малочка» і танная цяляціна

Цікава, што свініна была на прылаўках не круглы год. Напрыклад, з ліпеня па кастрычнік яна не прапаноўвалася пакупніку. Затое ў студзені прапанова была вялікай і каштавала гэта мяса 22 капейкі за фунт. Да вясны цэны падрaслі: 25 капеек за фунт, а ў маі знізіліся — 20 капеек за той жа аб'ём. А вось курынае мяса было ў асартыменце практычна круглы год (ад 70 капеек да 1,5 рубля за тушку). Пеўні ішлі асобнай катэгорыяй і былі таннейшымі: 50-55 капеек за штуку. Гусі (не паказана, жывыя ці абскубаныя) каштавалі 2 рублі за штуку ў студзені і 1,5-1,6 — у лістападзе. Ялавічына, дарэчы, была таннейшай за свініну — для сучаснага пакупніка гэта нечакана. Каштавала яна 20 капеек за фунт у студзені, але бывала на рынку рэдка. Цяляціна ў маі і ўвогуле ішла па 15 капеек за фунт.

Дастаткова дарагімі затое былі яйкі (85-90 капеек дзясятак) і смятана (40-45 капеек за фунт). Цана на тварог вагалася ад 7-8 да 15 капеек за фунт, але з'яўляўся ён на рынку толькі з мая па жнівень. За кварту свежага малака прасілі 12 капеек.

Рыба (не сказана, мясцовая рачная ці марская прывазная) была сапраўдным далікатэсам — з'яўлялася на рынку толькі ў студзені, і прадавалі яе па 20 капеек за штуку. Атрымліваецца, 20 капеек за адну рыбку? Танней налавіць самому! Сыр таксама прадавалі «штукамі» (мабыць, галоўкамі?) — 40-45 капеек за адзінку, масла — 20 капеек за фунт і толькі зімой.

Сала, наш галоўны прадукт, на рынку было амаль круглы год. Зрэшты, улетку прапанова моцна падала, а вось кошт змяняўся





Унікальныя фотафакты аб Беларусі 1930-х захаваў для нас фотаальбом «Беларусь Савецкая», выдадзены ў 1932 годзе, — ілюстраваная справаздача дасягненняў БССР за першую пяцігодку.

не надта — ад 45 да 55 капеек за фунт. Такім чынам, і сто гадоў таму было яно дарагім, удвая даражэйшым за свежую свініну. Шырокім быў выбар, маркуючы па агульнай колькасці тавару, і каўбас (па ўсёй верагоднасці, «пальцам пханых» — аднаго з пазачасавых брэндаў нашай нацыянальнай кухні). Аматары каўбаскі павінны былі выкласці 30 капеек за фунт.

Што яшчэ можна было набыць на рынку? У вялікім асартыменце — рознага роду хатнюю жывёлу. Напрыклад, каня. За жарабя ў студзені прасілі 35 рублёў, але ў снежні дарослага каня прапаноўвалі ўжо за 80 рублёў. Да каня не шкодзілі б сані — яны ў студзені каштавалі 5-8 рублёў, але калі «рыхтаваць іх летам», то ўсяго 3 рублі. Карова каштавала 60 рублёў у студзені, у лютым кошт даходзіў да 75 рублёў, але, калі купляць «карміцельку» ўвосень, калі прапанова вышэйшая, можна было знайсці варыянты і больш бюджэтныя (23-35 рублёў). А вось авечак (ягнят) аддавалі ўсяго па 5 рублёў за штуку, парасят — за 1,5-2,5 рубля, верагодна, гледзячы па ўкормленасці (кошт на дарослую асобіну вар'іраваўся ад 10 да 25 рублёў), а куранят — па 20-25 капеек за адзінку.

## Хочаш сэканоміць — зрабі сам

Прапаноўвалася на рынку ў Асіповічах і магчымасць набыць мэблю. Праўда, дастаткова дорага. Камод, напрыклад, аддавалі за 20 рублёў (амаль па цане жарабяці). Шафку малую (напэўна, посудную) — за 15 рублёў, у такую ж суму абыходзіўся стол. Абрусы каштавалі ад 3 рублёў да 1,8. З кухоннага начыння самым бюджэтным набыццём былі лыжкі (думаецца, драўляныя) — 2 капейкі за штучку. А вось дзяжа (у якой пакідаюць «падыходзіць» цеста для хлеба) з «посуду» каштавала даражэй за ўсё — ад 50 капеек да 1,6 за адзінку: верагодна, у залежнасці ад якасці і відаў дрэва (хлеб атрымліваўся смачнейшы, калі гатаваўся ў дзяжцы з розных відаў дрэва, прычым дошчачкі павінны былі правільна чаргавацца). Але хлеб на рынку не прадаваўся, так што нічога не зробіш, трэба пячы самому. Булачныя, вядома, у Асіповічах былі, і ўсё ж свой хлеб для многіх быў калі не таннейшы, дык дакладна смачнейшы. Як і сёння — нездарма ж гаспадыні купляюць хлебапечкі і выкладваюць у «Інстаграм» фота выпечанага імі хатняга хлеба.

З таго, што быццам бы не патрэбна, але прыгожа, прапаноўваліся штучныя кветкі (думаецца, для дэкору жылля) — 15-25 капеек за адну (як фунт свініны!) — і тканыя дываны — 3 рублі за штучку. Можна было і адзецца. Напрыклад, світы (не пазначана, мужчынскія ці жаночыя) прапаноўвалі па 15 рублёў. Палатно белае прадавалася аршынамі (0,711 метра) і каштавала 25 капеек за аршын, нябеленае — танней.

У цэлым высноа просіцца сама сабой: нашым прабабулям і прадзедам, незалежна ад роду занятку, выгадней і эканомней было ўмець як мага больш у побыце рабіць сваімі рукамі. Дарэчы, такую ж выснову можна зрабіць, пагартаўшы рэкламныя аб'явы тых часоў у перыёдыцы. Што ж рэкламавалася?

— Цікава, што, пераважна, не спажывецкія тавары (як прывыклі нашы сучаснікі), а паслугі. Напрыклад, паслугі па рамонце. Відавочна, людзі былі ашчаднымі (і небагатымі), і аддавалі перавагу рамонту рэчаў, а не набыццю новых. А таксама паслугі медыцынскія і, што цікава, адукацыйныя, — распавядае Святлана Паўлавіцкая, гартаючы ўсесаюзны штотыднёвы ілюстраваны часопіс «Прожектор» за 1929 год.

Беражна перагортваючы старонкі, яна тлумачыць, што часопіс меў вялізны тыраж і быў папулярны ў тым ліку на тэрыторыі сучаснай Беларусі, у тагачаснай БССР.

— Значныя плошчы ў часопісе былі адведзены пад рэкламу кніг, якія выходзяць у розных выдавецтвах Саюза, — кажа суразмоўніца. — І сярод іх — велізарная колькасць дапаможнікаў. Проста адкрываем наўздагад і адразу ж бачым: «Кніга для гаспадынь, нарыхтоўкі і запасы на зіму» (кошт з перасылкай — 1 рубель), дапаможнік «Хатні рамеснік» (3 рублі), «Новы поўны дапаможнік кройкі і шыцця» і нават «Аўтамабільны даведнік, кіраўніцтва па ўсіх пытаннях» (таксама 3 рублі, высылаўся накладной платай). Выходзіла велізарная колькасць сельскагаспадарчых даведнікаў, якія складалі навукоўцы, — і для асабістага падворка, і для буйных гаспадарак, напрыклад вядомы «Каляндар калгасніка». Такія кнігі і брашуры выпісвалі, на іх не шкадавалі грошай, бо новыя ўменні і веды дазвалялі і эканоміць, і развівацца.

Дарэчы, нядрэнная парада з мінулага: а ці не асвоіць у якасці эканоміі, адпачынку і развіцця які-небудзь карысны навык? Скажам, шыць або пячы хлеб... Нават калі не атрымаецца — будзе цікава. З аднаго боку, купіць цяпер можна амаль усё, з другога — дык і кнігі-дапаможніка ў нашы дні не трэба: знаходзь майстар-клас і спрабуй...

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# Суп для «Моны Лізы»

## Чаму Еўропу паралізаваў маштабны бунт фермераў?




**У Еўропе пашыраюцца шматтысячныя пратэсты фермераў. Сельгасвытворцы перакрываюць буйныя аўтамагістралі, парты, цэнтральныя вуліцы гарадоў. Найвялікшыя маштабы бунт фермераў набыў у Францыі, дзе работнікі аграпрамысловай галіны фактычна ўзялі ў аблогу Парыж. Пратэсты ахапілі ўсю краіну. Неспакойна і ў Германіі, дзе фермеры працягваюць акцыі ўжо каторы тыдзень. Да іх далучыліся сельгасвытворцы з Бельгіі, Італіі, Польшчы, Румыніі, Грэцыі, Іспаніі і шэрагу іншых краін. Такім чынам, пратэсная хваля накрыла амаль што ўвесь Стары свет. Чаму Еўропу паралізаваў маштабны бунт фермераў, чаго чакаць надалей?**

### «ХВОРАЯ» ГАЛІНА

Французскія фермеры лічаць, што меры па абароне экалогіі, якія насаджаюцца ўрадам, робяць іх неканкурэнтаздольнымі. «Праблема ў тым, што стандарты для нас устанаўліваюць людзі, якія сядзяць у кабінетах. Яны распавядаюць нам пра пацяпленне клімату і кліматычныя пагрозы. Але пры гэтым яны не разумеюць, што калі засуха — насенне не ўзыходзіць. Калі мы паліваем нашы палеткі — нас штрафуюць. Таму з нас даволі!» — распавёў агенцтву Reuters Крыстаф, уладальнік гаспадаркі ў дэпартаменце Уаза.

Кіраўнік Нацыянальнай федэрацыі сельскагаспадарчых прафсаюзаў Францыі (FNSEA) Арно Русо таксама раскрытыкаваў палітыку Парыжа і Бруселя ў дачыненні да ўкраінскага імпарту. На яго думку, неабходны квоты. Ільготы прыводзяць да несумленнай канкурэнцыі на ўнутраным рынку, і да таго ж прадукцыя з Украіны не адпавядае еўрапейскім стандартам. Як паведаміла РІА «Новости», паводле даных FNSEA, на мінулым тыдні пратэставалі больш за 72 тысячы фермераў па ўсёй краіне. У акцыях задзейнічалі звыш 40 тысяч трактароў. У МУС гавораць аб дзесяці тысячах пратэстоўцаў.

Барыкады са стагоў сена, гнаявых куч і пакрышак перакрылі асноўныя транспартныя магістралі. Улады мабілізавалі 15 тысяч паліцэйскіх і жандараў, каб прадухіліць аблогу сталіцы і буйных гарадоў. Затрымалі дзясяткі чалавек. Эмануэль Макрон у самы разгар беспарадкаў працягваў міжнароднае турнэ, даручыўшы разбірацца з сітуацыяй маладому прэм'еру Габрыэлю Аталю. У Індыі прэзідэнт Францыі адмовіўся каментаваць пратэсты. Праз два дні ўжо быў у Швецыі. Журналісты меркавалі, што ён перапыніць паездку, але гэтага не адбылося.

Як адзначаюць аналітыкі, усё прэзідэнцтва кіраўніка Пятай рэспублікі Эмануэля Макрона праходзіць пад знакам буйных сацыяльных пратэстаў. Так, падчас яго першага тэрміну Францыю скалыналі масавыя акцыі «жоўтых камізэлек», да якіх цяпер дадаўся рух фермераў. На думку экспертаў, шмат у чым гэта звязана з ідэалогіяй, якой прытрымліваюцца Макрон і яго асяроддзе. «Макрон прытрымліваецца глабалісцкіх ліберальных тэорый і ставіць за мэту сваёй палітыкі развіццё еўрапейскай інтэграцыі і «зялёны пераход», што згубна адбілася на цэнах на энерганосьбіты. Гэта адна з прычын пратэстаў», — адзначыў RT вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута Еўропы РАН, эксперт па Францыі Сяргей Фёдараў.

У сваю чаргу, дацэнт Акадэміі працы і сацыяльных адносін Павел Фельдман нагадаў, што ў Макрона заўсёды былі складаныя адносіны з прафсаюзамі. «У Макрона даволі напружаныя адносіны з сацыялістычнымі партыямі, прафсаюзамі і рабочым рухам. Яны не прынялі яго ў якасці прэзідэнта, ім непрыемна, што на чале краіны стаіць рэтранслятар трансатлантычных інтарэсаў ЗША, які прытрымліваецца жорсткага ліберальнага вектару ў эканамічнай і сацыяльнай палітыцы», — растлумачыў спецыяліст у гутарцы з RT.



### ЗА РЫСАЙ БЕДНАСЦІ

Пратэсты не абмінулі і... Луўр. Дзве абаронцы навакольнага асяроддзя ў музеі аблілі супам карціну Леанарда да Вінчы «Джаконда» («Мона Ліза»), паведаміў французскі тэлевізійны канал BFM TV. На шчасце, сусветна вядомая карціна не пацярпела, бо знаходзіцца пад браніраваным шклом. Жанчын з супам спынілі супрацоўнікі Луўра. Яны закрылі экранамі з тканіны прастору перад карцінай і папрасілі наведвальнікаў выйсці з залы, пасля чаго пачалі чысціць запэцканае ахоўнае шкло. Свае дзеянні экаактывісткі патлумачылі жаданнем пашыраць «права на здаровае і ўстойлівае харчаванне». Яны таксама адзначылі, што сельскагаспадарчая галіна Францыі «хворая». Паводле інфармацыі AFP, акцыю правялі ўдзельнікі групы актывістаў пад назвай Riposte Alimentaire («Харчовая рэакцыя»). У заяве групы, апублікаванай у сацсетцы, гаворыцца, што акцыя ў Луўры — частка намаганняў па інтэграцыі «харчавання ў агульную сістэму сацыяльнага забеспячэння».

Пратэсты фермераў у Францыі працягваюцца ўжо больш чым два тыдні. Выкарыстоўваючы сельгастэхніку, дэманстранты заблакіравалі шэраг трас у краіне, што прывяло да спынення руху і выклікала перабоі з падвозам прадуктаў у супермаркеты. Незадаволеныя фермеры вылучылі спіс больш чым са 100 прэтэнзій да французскага кіраўніцтва. «Фермеры незадаволены сваім становішчам, ім цяжка эканамічна. Яны працуюць у нуль, а то і ў мінус, таму патрабуюць перагледзець дзяржаўную палітыку ў сферы сельскай гаспадаркі, а таксама некаторыя рашэнні Бруселя», — распавёў Сяргей Фёдараў.

Адной з галоўных прычын пратэсту фермераў стала падаражанне дызелю, падкрэсліваюць спецыялісты. Як адзначае тэлеканал France 24, «гэты небяспечны для навакольнага асяроддзя тып паліва, які прымяняецца ў сельгастэхніцы, доўгі час карыстаўся падтрымкай урада ў выглядзе падатковых ільгот», аднак кіраўніцтва краіны ў рамках рэалізацыі палітыкі энергетычнага пераходу вырашыла адмяніць адпаведныя паслабленні.

Акрамя таго, фермеры незадаволены невыкананнем прынятага ў 2018 годзе закона EGalim, адной з ключавых мэт якога была абарона даходаў работнікаў сельскай гаспадаркі. Сярод прычын пратэстаў, паводле інфармацыі агенцтва Reuters, называецца і рост імпарту аграпрадукцыі з Украіны, для якой ЕС адмяніў квоты і пошліны. У дадатак да гэтага Брусель аднавіў перагаворы па заключэнні гандлёвага пагаднення паміж ЕС і Паўднёваамерыканскім агульным рынкам (МЕРКАСУР), што выклікала апасенні фермераў адносна будучых умоў канкурэнцыі ў галіне вытворчасці цукру, збожжа і мяса. Справа ў тым, што замежныя вытворцы знаходзяцца ў больш выгадным становішчы, паколькі, у адрозненне ад еўрапейскіх фермераў, яны не абавязаны выконваць у сваёй працы жорсткія экалагічныя стандарты ЕС.

У скарбонку незадаволенасці французскіх сельгасвытворцаў леглі і новыя нормы Еўрасаюза ў сферы аховы навакольнага асяроддзя,



якія ўскладняюць і без таго няпростае вядзенне бізнесу ў гэтай сферы. Усе гэтыя фактары супалі са складанай сітуацыяй у сельскагаспадарчай галіне. Як паведамляе France 24, у Францыі доля фермерскіх хатніх гаспадарак, якія жывуць за рысай беднасці (17,4 працэнта), вышэй, чым сярод рабочых (13,9 працэнта) і служачых (12,1 працэнта), і амаль удвая вышэй, чым сярод астатняга насельніцтва краіны (9,2 працэнта).

Спрабуючы спыніць пратэсты, паведамляе France 24, прэм'ер-міністр Францыі Габрыэль Аталь на мінулым тыдні наведаў некалькі фермаў і выслухаў патрабаванні сельгасвытворцаў. Па выніках сваёй паездкі ён аб'явіў аб прыняцці тэрміновых мер, якія ўключаюць у сябе адмову ад павышэння падатку на дызпаліва для пазадарожнай тэхнікі, павышэнне памеру кампенсацый для жывёлагадоўчых прадпрыемстваў, на якіх буйная рагатая жывёла пацярпела ад эпізаатычнай гемарагічнай хваробы, а таксама прыняцце жорсткіх карных мер супраць трох прадпрыемстваў сельгассектара, якія не выконваюць палажэнні закона EGalim. Але абяцанні, дадзеныя прэм'ерам, падзялілі пратэстоўцаў на два лагеры: частка з іх пасля заявы прэм'ера вырашылі разблакіраваць трасы, а іншыя палічылі перапалічаныя Аталем меры недастатковымі і заявілі аб намеры працягваць пратэсты.

### ТРЫВОЖНЫЯ СІГНАЛЫ

Днямі фермеры з шэрагу еўрапейскіх краін заблакіравалі будынак Еўрапарламента ў Бруселі. «Гэта як эфект даміно. У іншых краінах прычыны незадаволенасці насельніцтва падобныя: шмат банкруцтваў, вытворцы не вытрымліваюць канкурэнцыі, незадаволеныя ростам цэн на энерганосьбіты і гэтак далей. Фермеры патрабуюць увагі дзяржавы да гэтай сітуацыі», — кажа Сяргей Фёдараў.

Сельскагаспадарчая палітыка — прэрагатыва нацыянальных урадаў, дадае дацэнт кафедры еўрапейскага права Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных зносін Мікалай Тапарнін. «Кожная краіна вырашае праблемы ў адпаведнасці з уласнымі магчымасцямі. Падаплёка канфліктаў ва ўсіх розная. Французы разлічваюць на нявопытнасць новага прэм'ера, які пры ўсім жаданні не зможа даць ім тага, чаго яны патрабуюць», — разважае ён.

Улады імкнуцца ісці на саступкі. «У Францыі і Усходняй Еўропе ёсць праблема з пастаўкамі на ўнутраны рынак таннай сельгаспрадукцыі з іншых краін. Патрэбныя квоты і пошліны. Але калі Украіна — не член Еўрасаюза, і з ёй асобная размова, то, напрыклад, з Іспаніяй ці Партугаліяй, адкуль таксама паступае імпарт, так не атрымаецца», — заўважае палітолаг. Эксперты сыходзяцца ў меркаванні, што галоўная прычына дысбалансу еўрапейскага сельскагаспадарчага рынку — перавытворчасць. Лішкі сёння проста знішчаюць.

Прычыны пратэсту звязаны з глыбокім крызісам у сельскагаспадарчай сферы, канстатуе прафесар Жэроен Кандэль з Вагенінгенскага ўніверсітэта ў Нідэрландах. Як лічыць эксперт, «трывожныя сігналы» былі бачныя даўно: «У аснове праблемы ляжыць супярэчнасць паміж імператывамі сучаснай сельскай гаспадаркі і неабходнасцю абароны далікатных экасістэм нашай планеты. Еўрапейскія фермеры апынуліся ў павуцінні правіл і рынкавых сіл, якія ўсё больш абмяжоўваюць іх аўтаномію і здольнасць атрымліваць справядлівы прыбытак».

Раней кіраўнік Мінсельгаса Венгрыі Іштван Надзь заявіў, што краіны Вішаградскай групы, куды таксама ўваходзяць Польшча, Чэхія і Славакія, папярэдзілі Еўракамісію пра пагрозу распаўсюджвання пратэстаў на ўвесь кантынент, калі тая не абароніць інтарэсы аграрыяў.

«Мы пагадзіліся з тым, што Бруселю неабходна тэрмінова заняцца складанай сітуацыяй, у якой апынуліся еўрапейскія фермеры, — напісаў міністр на сваёй старонцы ў Facebook. — У адваротным выпадку хваля пратэстаў, якія пачаліся ў Заходняй Еўропе, восенню можа з лёгкасцю перарасці ў агульнаеўрапейскую хвалю».

Як адзначыў у эфіры «Альфа Радыё» аналітык Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў Аляксей Аўдонін, пратэсты фермераў у краінах — гэта вынік таго, што дзейнасць урадаў гэтых дзяржаў не адпавядае інтарэсам простых работнікаў. «Урады еўрапейскіх дзяржаў робяць усё, што цікава менавіта буйному капіталу — банкам, карпарацыям. А хто такія фермеры? Для эліты яны ніхто, для ўрада іх праца нізкааплатная, непатрэбная, таму што ў краіне ёсць буйныя харчовыя карпарацыі, якія будуць пастаўляць такую ж прадукцыю па значна ніжэйшых цэнах. Таму ўраду фермеры ў эканамічных працэсах не патрэбныя, адсюль такая палітыка выключэння любых датацый». Аляксей Аўдонін заявіў, што падзеі вядуць да банкруцтва фермераў: «За апошнія тры гады ўзровень банкруцтва фермераў павялічыўся ў дзясяткі разоў. І цяпер людзі выходзяць на вуліцы з-за таго, што іх дробныя прадпрыемствы стаяць на шляху да банкруцтва або ўжо ў гэтай яме. Калі так будзе і далей працягвацца, усё гэта можа перарасці ў грамадзянскую вайну. Ды ўжо сёння пратэсты носяць схаваны характар грамадзянскай вайны паміж карпаратыўнымі элітамі і простым народам».

**Захар БУРАК.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Мётча Агро»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Агрегат дисковой универсальный АДУ-6, инв. № 1993 | 7440,00 | 744,00 | 372,00 |
| 2 | Агрегат почвообрабатывающий посевной АПП-6Д, инв. № 3592 | 129 240,00 | 12 924,00 | 6462,00 |
| 3 | Машина первичной очистки зерна МЗС-20, инв. № 3720 | 7200,00 | 720,00 | 360,00 |
| 4 | Плуг полунавесной оборотный ППО-8-40 К, инв. № 3617 | 8520,00 | 852,00 | 426,00 |
| 5 | Погрузчик с телескоп. стрелой АМКОДОР 527 (ОК-5 0612), инв. № 3618 | 80 160,00 | 8016,00 | 4008,00 |
| 6 | Распределитель минеральных удобрений РУ-7000, инв. № 1292 | 10080,00 | 1008,00 | 504,00 |
| 7 | Трактор Беларус-320.4 (в пласт. облиц.) (ОК-5 0607), инв. № 3596 | 5760,00 | 576,00 | 288,00 |
| В отношении лотов №№ 1–7 проводятся первые торги | | | | |
| **Местонахождение лотов №№ 1–7:** Минская обл., Борисовский р-н, Метченский с/с, вблизи д. Старая Мётча. GPS-координаты: 54.179354, 28.711073 | | | | |
| Лоты №№ 1–7 имеют обременения в виде лизинга. Вопросы по обременениям по тел. +375293110464 (Анастасия) | | | | |
| **Дата и время проведения торгов** | **7 марта 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** | | | |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | **С 10.00 05 февраля 2024 года до 16.00 5 марта 2024 года** | | | |

**Условия для участия в торгах:**
1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Метча Агро», проводимых 07.03.2024.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2 экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой (220113, г. Минск, а/я 524) или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления являются дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. **Вознаграждение аукциониста – 7 % от конечной цены предмета торгов.**
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) календарных дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375293042560.**
8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ООО «Мётча Агро» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел.: +375293110464, 80173958917 (Минская обл., Борисовский р-н, Мётченский с/с, д. Старая Мётча, ул. Почтовая, д. 1, УНП 190564818)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, ☎ тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

## Извещение о проведении **6 марта 2024 года** торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| **Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)** | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **№ предмета торгов** | **Наименование имущества** | **Год выпуска** | **Инвентарный номер** | **Номер шасси** | **Начальная цена, бел. руб., без учета НДС** | **Размер задатка, бел. руб.** |
| 1 | Прицеп МАЗ-83731 3010 | 2013 | 5004359 | Y3M837310D0000054 | 9 333,00 | 930,00 |
| 2 | Прицеп МАЗ-870100 | 2016 | 5004610 | Y3M870100G0000413 | 7 956,00 | 790,00 |
| 3 | Автопогрузчик вилочный «Амкодор 451А» | 2011 | 4254641 | 513 | 7 140,00 | 710,00 |
| 4 | Автомобиль МАЗ-437130-337 | 2006 | 5003602 | Y3M43713060000022 | 5 716,50 | 570,00 |
| 5 | Автомобиль самосвал МАЗ-4570W1 | 2012 | 5004223 | Y3M4570W1C0000021 | 14 059,50 | 1 400,00 |
| 6 | Автомобиль МАЗ-6312В9-470-010 | 2013 | 5004268 | Y3M6312B9D0000093 | 30 230,50 | 3 020,00 |
| 7 | Автомобиль МАЗ-6312В9-470-010 | 2013 | 5004408 | Y3M6312B9D0000592 | 35 535,00 | 3 550,00 |
| 8 | Прицеп МАЗ-837310-3010 | 2009 | 5003991 | Y3M83731090000002 | 2 832,50 | 280,00 |
| 9 | Прицеп МАЗ-837810-014 | 2013 | 5004354 | Y3M837810D0015001 | 8 755,00 | 870,00 |
| 10 | Автопогрузчик вилочный «Амкодор 451А» | 2011 | 4254429 | 479 | 11 072,50 | 1 100,00 |
| 11 | Автопогрузчик вилочный «Амкодор 451А» | 2007 | 4253098 | 237 | 11 072,50 | 1 100,00 |
| 12 | Автомобиль УАЗ-31519-031 | 1997 | 5003001 | 31514070001954 | 1 957,00 | 190,00 |
| 13 | Автомобиль VOLKSWAGEN PASSAT | 2008 | 5003792 | WVWZZZ3CZ8P130205 | 6 386,00 | 630,00 |
| **Местонахождение имущества:** г. Минск, пер. Промышленный, 7 (перед осмотром просим уточнить местонахождение техники по телефону 8017 395 62 96) | | | | | | |

Продавец имущества: ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, в том числе индивидуальные предприниматели, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, код платежа – 40901, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 06.03.2024 по предмету торгов №__.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **06 марта 2024 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7 (зал аукционов).

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 05.02.2024 по 04.03.2024** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:** (017) 360 42 22 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 395 62 96 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).

## Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Лот:** изолированное помещение с инвентарным номером 121/D-3677 **(наименование: квартира № 2; назначение: квартира),** площадью 25,1 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Дрогичинский р-н, Дрогичинский с/с, д. Нагорье, ул. Железнодорожная, д. 71, кв. 2

| **Начальная цена, руб.** | 2 190,15 | **Размер задатка, руб.** | 219,02 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** РСУП «Брестплемпредприятие», г. Брест, ул. Карбышева, 35, тел. 80162530948. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./факс 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа 40901. **Условия продажи:** возможно предоставление рассрочки оплаты стоимости имущества в случае подачи заявления. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 10 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 20 февраля 2024 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона www.ocenkabrest.by, на сайте Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (https://au.nca.by/auction/21671), а также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**

**Последний день приема заявлений – 19 февраля 2024 г. до 17.00**

## ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению Проектно-изыскательского унитарного предприятия «Институт Полесьепроект» ОАО «Полесьестрой» (продавец) извещает о проведении 14 февраля 2024 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Капитальное строение с инв. № 330/С-6044**, общей площадью **220,1 кв. м,** назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – **административно-бытовой корпус** (составные части и принадлежности: цокольный этаж, покрытие, ограждение, навес). Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **341500000001000125** общей площадью **0,1162 га (право постоянного пользования). Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Рыжкова А.А., 13. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания административно-бытового корпуса | **129 000,00** | 6 450,00 |

**Продавец:** Проектно-изыскательское унитарное предприятие «Институт Полесьепроект» ОАО «Полесьестрой», 247760, г. Мозырь, ул. Ленинская, 12.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляются по контактному тел. **8 (029) 734-74-00, Дайнеко Наталья Олеговна. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (Проектно-изыскательское унитарное предприятие «Институт Полесьепроект» ОАО «Полесьестрой»):** р/с BY39BLBB30120400087444001001 в ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, УНП 491199000, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 5 февраля 2024 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 12 февраля 2024 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Продавцом** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также возместить Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) рабочих дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона, оплатить приобретаемое имущество Продавцу в течение **5 (пяти) календарных дней** после подписания договора купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона – www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»),** Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь www.gki.gov.by в разделе «Продажа/Аренда имущества», далее – «Продажа и аренда государственной недвижимости. Единая база».

**Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 29.04.2023 г. № 81 (29961).**

**Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

**Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 341-15-45, 8 (044) 599-18-16.**

Баі за Беларусь

# ПОДЗВІГІ НА ЗЯМЛІ І Ў НЕБЕ

## У Калінкавіцка-Мазырскай аперацыі, 80-годдзе якой адзначаецца гэтымі днямі, было нямала герояў

**Для гітлераўскага камандавання Калінкавіцкі вузел чыгуначных і шасэйных дарог меў выключную важнасць, а таму вораг прыняў усе меры для ўмацавання сваіх пазіцый. Аднак доўгачасовыя абарончыя збудаванні, канцэнтрацыя вялікай колькасці танкаў, гармат і мінамётаў не спынілі наступленне савецкіх войскаў. Крывапралітныя баі разгарнуліся на зямлі і ў небе. Нягледзячы на тое, што сітуацыю яшчэ ўскладняла цяжкапраходная балоцістая мясцовасць і няўстойлівае надвор'е, калі моцныя маразы раптоўна змяняліся адлігай, чырвонаармейцы паспяхова справіліся з пастаўленымі задачамі. Толькі за вызваленне Калінкавіцкага і Мазырскага раёнаў савецкія войскі заплацілі вельмі высокую цану — у сотнях брацкіх магіл спачываюць тысячы нашых салдат і афіцэраў.**



Помнік воінам-вызваліцелям у Калінкавічах.

### АПОШНІ ПОДЗВІГ ЭКІПАЖА

Непадалёк ад Калінкавіч, на ўзбочыне шашы Калінкавічы — Жыткавічы, узвышаецца стэла з зоркай на вяршыні. Гэта помнік гераічнаму экіпажу самалёта 54-га бамбардзіровачнага палка, устаноўлены ў 1975 годзе на месцы яго гібелі. Свой апошні подзвіг члены экіпажа — камандзір падпалкоўнік Мікалай Крыўцоў, штурман маёр Іван Сомаў і стралок-радыст старшына Мікалай Паўлаў — здзейснілі за два дні да вызвалення Калінкавіч. 12 студзеня 1944 года лётчыкі ажыццявілі магутны авіяцыйны налёт на чыгуначны вузел, які быў запоўнены варожымі эшалонамі. Самалёты 301-й бамбардзіровачнай авіядывізіі, у тым ліку машына пад камандаваннем Мікалая Крыўцова, нанеслі вялікую шкоду праціўніку. З паветра было знішчана 52 вагоны з ваеннай маёмасцю, 15 аўтамашын з грузамі. Каля 20 станцыйных пабудоў было разбурана. Свой ахоплены полымем самалёт Мікалай Крыўцоў, Іван Сомаў і Мікалай Паўлаў накіравалі на групоўку варожых эшалонаў... Іменамі адважных воінаў назвалі вуліцы ў Калінкавічах.

Увогуле, лётчыкі, у прыватнасці, 16-й паветранай арміі, адыгралі вялікую ролю ў вызваленні Калінкавіч. Нягледзячы на дрэнныя метэаралагічныя ўмовы, яны бесперапынна бамбілі пазіцыі праціўніка, скапленні жывой сілы і тэхнікі, чыгуначны вузел. Паспяхова дзейнічалі авіятары 779-га, 57-га, 54-га бамбардзіровачных, 431-га штурмавога, 517-га знішчальнага і іншых палкоў. Лётчыкі толькі аднаго палка — 779-га, якім камандаваў палкоўнік А. Храмчанкаў, у час баёў за Калінкавічы здзейснілі звыш 200 вылетаў.

### АРТЫЛЕРЫСТ-ПІСЬМЕННІК

Аднак не заўсёды можна было спадзявацца на авіяцыю. У выпадку няўстойлівага надвор'я, калі знаходзіцца ў небе было небяспечна, а танкі не маглі прайсці з-за бездарожжа, асаблівае значэнне савецкае камандаванне надавала артылерыі. Невыпадкова з 21 воінскага злучэння і часці, якім у выніку было прысвоена ганаровае найменне «Калінкавіцкіх», дзевяць з'яўляліся артылерыйскімі. Артылерыстам неаднойчы даводзілася ўступаць у смяротныя сутычкі, дуэлі з ворагам, і практычна заўсёды яны выходзілі з іх пераможцамі. Ініцыятыва поўнасцю належала Чырвонай Арміі.

У тых найцяжэйшых баях прымаў удзел і камандзір узвода 20-й Сталінградска-Рэчыцкай артылерыйскай брыгады, дзевятнаццацігадовы малодшы лейтэнант Анатоль Ананьеў. Яму пашчасціла выжыць. Аб тым, што давялося перажыць, пасля вайны франтавік напісаў шмат раманаў і аповесцяў. Адзін з яго раманаў, «Вёрсты любові», прысвечаны жорсткім баям за Калінкавічы, удастоены Дзяржаўнай прэміі РСФСР.

### ГЕРОІ МАЗЫРШЧЫНЫ

За ўдзел у вызваленні Мазырскага раёна і раённага цэнтра 18 воінскіх злучэнняў і часцей атрымалі ганаровыя найменні «Мазырскіх». Нямала байцоў загінула пры вызваленні Мазыршчыны. Подзвігі многіх навечна ўпісаны ў гісторыю Беларусі.

Сярод іх — і Герой Савецкага Саюза Канстанцін Захараў. З першых дзён вайны ўраджэнец Іванава знаходзіўся на фронце, удзельнічаў у абароне Масквы. Лётчык-знішчальнік меў не адну перамогу ў паветраных баях, камандаваў эскадрылляй. У сакавіку 1942 года за баявыя поспехі быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Падчас баёў на Курскай дузе самалёт капітана Захарава ўзнімаўся ў паветра па сем-восем разоў на дзень. 21 ліпеня 1943 года эскадрылля авіятара вылецела на перахоп варожых бамбардзіроўшчыкаў у раёне Спаскага.



Мемарыяльны комплекс «Курган Славы» ў Мазыры.

Савецкія лётчыкі імкліва атакавалі ворага і збілі пяць самалётаў. За смеласць і вынаходлівасць, праяўленыя ў баях на Курскай дузе, Канстанціну Захараву была ўручана яшчэ адна ўзнагарода — ордэн Айчыннай вайны І ступені. Малады чалавек здзейсніў 190 баявых вылетаў, удзельнічаў у 41 паветраным баі, збіў 15 варожых самалётаў. Вызваляў Варонеж, Арол, Белград, Лоеў, Гомель і Мазыр.

13 студзеня 1944 года, падчас вызвалення Мазыршчыны, капітан Захараў разам са сваім экіпажам вёў паветраны бой з ворагам. Буйная аўтакалона гітлераўцаў была выяўлена на захад ад Мазыра. Па камандзе Захарава лётчыкі пачалі яе граміць, зніжаючыся да брыючага палёту. Аўтамашыны ўспыхнулі. У разгар бою ў лётчыкаў скончыліся боепрыпасы, і яны пачалі імітаваць атакі. У час аднаго з заходаў на цэль самалёт быў падбіты варожым снарадам і загарэўся. Да свайго аэрадрома было далёка, а сесці на тэрыторыю, занятую ворагам, азначала палон. Лётчыкі на гэта не пайшлі і накіравалі свой ахоплены агнём самалёт на вялікую колькасць гітлераўскіх машын.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 2 жніўня 1944 года капітану Канстанціну Захараву пасмяротна прысвоілі званне Героя Савецкага Саюза. На Мазырскім нафтаперапрацоўчым заводзе адважны камандзір залічаны ў калектыў рамонтна-механічнага цэха завода. У гонар Героя на прадпрыемстве ўстаноўлена мемарыяльная дошка.

Сярод тых, хто вызначыўся ў баях на Мазыршчыне і знайшоў там свой апошні прытулак, быў і ўраджэнец Кастрамской вобласці Іван Лапін. У Чырвонай Арміі малады чалавек служыў з 1927 да 1939 года. З пачаткам вайны быў мабілізаваны і пасля заканчэння курсаў малодшых лейтэнантаў у 1942 годзе трапіў на фронт. Іван Лапін быў камандзірам мінамётнай батарэі 56-га гвардзейскага кавалерыйскага палка.

Падчас наступлення на вёску Альшанае агнём яго батарэі былі знішчаны сем варожых гармат, два мінамёты. У пачатку кастрычніка 1943 года Іван Лапін знішчыў пяць гітлераўскіх батарэй, што забяспечыла нашым войскам паспяховае фарсіраванне ракі Брагінка. У тым баі было знішчана 120 нацыстаў. Падчас наступлення чырвонаармейцаў на Мазыр 12 студзеня 1944 года каля вёскі Прудок камандзір мінамётнай батарэі загінуў. Пахаваны воін у Гомелі. Яго імя носяць вуліца ў абласным цэнтры і вёска, дзе адважны чырвонаармеец нарадзіўся.

Ленінградзец Валянцін Няжноў у ліку першых фарсіраваў Днепр каля вёскі Глушэц Лоеўскага раёна. Сувязісты пад камандаваннем старшага лейтэнанта, камандзіра падраздзялення сувязістаў 29-га палка 12-й гвардзейскай стралковай дывізіі праклалі тэлефонную лінію і ўстанавілі сувязь з захопленым плацдармам. У ходзе баёў на пераправе Валянцін Няжноў некалькі разоў падымаў байцоў у атаку. Загінуў пры вызваленні Мазыршчыны 24 студзеня 1944 года. Пахаваны ў Мазыры, дзе яго імем названа вуліца.

### ПАРТЫЗАНЫ-ВЫЗВАЛІЦЕЛІ

Удзельнікам Калінкавіцка-Мазырскай наступальнай аперацыі дапамагалі і партызаны. Народныя мсціўцы разбуралі варожыя камунікацыі, актыўна ўдзельнічалі ў баях.

Адным з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў Палескай вобласці, адміністрацыйным цэнтрам якой з'яўляўся Мазыр, быў Аляксандр Жыльскі. У Чырвоную Армію ён трапіў у 1931 годзе. Калі пачалася вайна, быў накіраваны ў варожы тыл. У лістападзе 1942-га — маі 1943 года Аляксандр Жыльскі з'яўляўся камандзірам партызанскіх атрадаў у Ельскім і Мазырскім раёнах, затым — камандзірам Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага. У 1944—1948 гадах гэты адважны чалавек, за спінай якога было нямала асабістых подзвігаў, узначальваў Мазырскі райвыканкам. Пасля працаваў у Гомелі і Гомельскай вобласці. На кіцелі партызана ззяла нямала ўзнагарод, сярод якіх — ордэн Леніна.

Камісарам Мазырскай партызанскай брыгады імя Аляксандра Неўскага (у верасні — снежні 1943 года) з'яўляўся Міхаіл Ільінкоўскі. Адначасова ён быў сакратаром Мазырскага падпольнага райкама КП(б)Б. У партызанах давaенны настаўнік і дырэктар школы, старшыня Ельскага райвыканкама знаходзіўся са жніўня 1941 года. За гэты час здзейсніў нямала подзвігаў.

Увогуле, перыяд вызвалення Беларусі — гэта час герояў. Што ні імя, то подзвіг. Савецкія салдаты і афіцэры адчувалі хуткую Перамогу, а таму рабілі ўсё магчымае і немагчымае, каб выгнаць ворага з нашай шматпакутнай зямлі.

**Вераніка КАНЮТА,**
**Барыс ДАЎГАТОВІЧ,**
**кандыдат гістарычных навук.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

# ШУКАЛЬНІК СКАРБАЎ НАРОДНАГА КАСЦЮМА

**«Рэдкае гэта прозвішча — Баразна. Хлебаробнае, хлебароднае. Дарагое аратайнай душы. Як і Скарына...» Так пісаў пра мастака і этнографа Лявона Баразну народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін.**







Плён дзейнасці Лявона Баразны, які загінуў у 1972 годзе, мы можам бачыць шмат дзе — напрыклад, на нядаўняй выставе ў Нацыянальным мастацкім музеі «Код прыгажосці», прысвечанай беларускаму народнаму касцюму. Там былі прадстаўлены яго замалёўкі з этнаграфічных экспедыцый, узоры арнаменту. Баразна апантана збіраў усё, што датычыцца народнай вопраткі і традыцыйнага побыту, падрыхтаваў некалькі альбомаў малюнкаў. Менавіта ён распрацоўваў канцэртныя касцюмы для ансамбля «Песняры», а таксама для пятнаццаці самадзейных калектываў. Рыгор Барадулін недарэмна звязвае імёны Баразны і Скарыны — бо мастак даследаваў гравюры першадрукара.

1 лютага ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва прайшоў вечар памяці мастака, прысвечаны 95-годдзю з дня яго нараджэння. Адбылося адкрыццё экспазіцыі, на якой прадстаўлены унікальныя артэфакты з фондаў архіва-музея. Успомніць адметнага чалавека, які трагічна загінуў вельмі рана, у сорак тры, але пакінуў па сабе заўважны след, прыйшлі мастакі і мастацтвазнаўцы, этнографы, музейшчыкі, гісторыкі — усе, хто з удзячнасцю карыстаецца адкрытым Лявонам Баразной этнаграфічным багаццем.

**Дырэктар Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва Алена МАКАРАНКА,** якая адкрыла вечарыну, распавяла пра фонд мастака, які захоўваецца ў архіве-музеі і, дарэчы, яшчэ камплектуецца. Прысутнічалі і дзве дочкі мастака, якія займаюцца папулярызацыяй спадчыны бацькі. Старэйшая дачка Алена распавяла пра іх сям'ю, дзе шанавалася беларуская культура, збіралася творчая інтэлігенцыя — дастаткова сказаць, што хросным бацькам дзяцей Лявона Баразны быў Уладзімір Караткевіч.

Вядомы **мастацтвазнаўца, культуролаг, этнолаг Вольга ЛАБАЧЭЎСКАЯ** згадала нядаўнюю выставу «Код прыгажосці», дзе ўпершыню было прадстаўлена настолькі шырока багацце беларускага народнага касцюма. А пачыналася ўсё з экспедыцый у тым ліку Лявона Баразны.

— Наша культура, на жаль, па сваім характары арыентавана на памерлых: мы ўспамінаем людзей, іх напрацоўкі тады, калі яны пайшлі з жыцця, калі прайшло некалькі дзесяцігоддзяў пасля іх сыходу... Сёння вяртаецца цікавасць да зробленага Лявонам Баразной, — адзначыла Вольга Аляксандраўна. — Ён быў пачынальнікам. Нашаму грамадству спатрэбілася семдзесят гадоў, каб асэнсаваць зробленае ім, тое, што сведчыць пра вытанчанасць, высокую мастацкую вартасць беларускага народнага касцюма. Як мастак Лявон Баразна быў чулы на прыгажосць. Думаю, ён сам захапляўся тымі строямі, якія бачыў і фатаграфаваў у сваіх экспедыцыях. Ён, па сутнасці, заклаў асновы рэканструкцыі народнага касцюма. І той сённяя жыве — на фестывалях, канцэртах і нават у побыце. Як сапраўдны скарб, наробак Лявона Баразны выйшаў на паверхню і стаў часткай нашай агульнай культурнай спадчыны.

Падрабязнасцямі свайго сяброўства з Лявонам Баразной падзяліліся яго сябры, знаёмыя. Не забываюць Баразну і ў яго родным Талачыне, дзе ён і пахаваны. Талачынец Зміцер Іўчанка працуе не толькі на чыгунцы, але і ў народнай кінастудыі «Летапіс», што дзейнічае на базе мясцовага цэнтра культуры. Зміцер распавёў, як адбываліся здымкі дакументальнага фільма «Лявон Баразна... Адданае сэрца», рэжысёрам якога ён стаў. З фільма можна даведацца, напрыклад, што пісьменнік Павел Міско выкарыстаў у сваёй аповесці «Калянае лісце» ўспаміны Лявона Баразны пра знаходжанне ў фашысцкіх засценках — юны мастак, сын партызана, быў падпольшчыкам і цудам ацалеў. Таксама пра тое, што ў мастацкай вучэльні аднакурснікам Лявона Баразны быў Міхал Савіцкі, а настаўнікам — Віталь Цвірка, і шмат іншых цікавінак.

Зміцер Іўчанка падзяліўся радасцю: у хуткім часе на доме на станцыі Талачын, дзе жыў мастак, адкрыецца мемарыяльная дошка. Дачка Лявона Баразны Алена ўдакладніла, што ёсць цікавыя матэрыялы пра Лявона Баразну і ў Талачынскім краязнаўчым музеі, дзе час ад часу адбываюцца часовыя экспазіцыі пра мастака-земляка.

На выставе ў БДАМЛМ можна пабачыць не толькі эскізы народных касцюмаў, зробленыя Лявонам Баразной, але і фотаздымкі, дакументы, а таксама пейзажы, якія сведчаць пра рознабаковасць яго таленту.

**Людміла ІВАНОВА.**

# «ЦЯЖКІЯ ДАРОГІ ЖЫЦЦЯ» МІКАЛАЯ ЧАРГІНЦА

**Народны пісьменнік Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ прэзентаваў свае мемуары ў Нацыянальнай бібліятэцы. Гэта чатыры кнігі з цыкла аўтабіяграфічных раманаў «Цяжкія дарогі жыцця», у якіх аўтар дзеліцца сваім багатым жыццёвым досведам. Тут і дзіцячыя ўспаміны аб Вялікай Айчыннай вайне, і спартыўная кар'ера, і работа ў органах унутраных спраў, і афганскі перыяд.**



— Кнігі напісаны як аўтабіяграфічны раман. Але чытаюцца займальна, як трылер ці дэтэктыў. Там цудоўна выбудаваны дыялогі, сцэны. Яны вельмі кінематаграфічныя, — так падчас прэзентацыі падзяліўся сваімі ўражаннямі ад «Цяжкіх дарог жыцця» **дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Іван САВЕРЧАНКА,** — Мы ведаем розныя навуковыя працы, нейкія акадэмічныя выданні. Але калі чытаеш гэту кнігу, ты літаральна «ўваходзіш» у тую атмасферу. Талент пісьменніка выдатна перадае той час, пачуцці людзей, іх чаканні, іх памкненні і страхі.

Сам жа Мікалай Іванавіч на мерапрыемстве заявіў, што цвёрда перакананы ў тым, што абавязак кожнага пісьменніка, які бачыў на свае вочы Вялікую Айчынную вайну, расказаць пра гэта. Уяўна вяртацца ў некаторыя эпізоды жыцця — вельмі цяжка.

— Прыходзіцца часам ледзь не са слязьмі, успамінаючы, пісаць, — прызнаецца аўтар.

Мікалай Чаргінец не толькі таленавіты пісьменнік, але і палітык, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, ганаровы грамадзянін Мінска, уладальнік міжнародных прэмій, дзяржаўных узнагарод. Яго чытаюць па ўсім свеце, агульны тыраж выдадзеных твораў складае больш за сем мільёнаў экземпляраў.

Паводле слоў **генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Вадзіма ГІГІНА,** Мікалай Чаргінец — яскравы прыклад паспяховага беларускага чалавека.

— Таленавіты, прыгожы, сябраваў з маці Юрыя Гагарына і ўсёй яго сям'ёй, некалькі жыццяў пражыў, — распавядае Вадзім Гігін. — Пасля вайны з футбольнай камандай трапіў у паўразбураны яшчэ Пхеньян, бачыў Кім Ір Сена — у той час, у 1950-я гады, гэта было як на іншую планету трапіць. Пасля перайшоў на працу ў крымінальны вышук, тройчы датэрмінова прысвойвалася яму званне. Гэта менавіта той міліцыянер, які першым прыехаў на месца трагічнай гібелі Пятра Міронавіча Машэрава. І я асабіста ад «афганцаў» чуў гісторыі пра Чаргінца, у тым ліку пра тое, як ён людзям выратаваў жыццё.

Працяг абавязкова будзе. Ужо сёлета новая частка мемуараў выйдзе ў свет. Мікалай Чаргінец прыадчыніў заслону таямніцы і падзяліўся тым, што чакае чытачоў у новай кнізе:

— У ёй я пішу пра перыяд развалу Савецкага Саюза: цяжкі час, найбяднейшы стан краіны, развал эканомікі, людзі на вуліцах абураюцца, патрабуючы заробку і працы, заводы стаяць... Тады мы і пазнаёміліся з Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам. Я на той момант не верыў, што малады хлопец з вёскі зможа дапамагчы беларусам. Я памыліўся. З яго энергіяй і выключным талентам удалося гэта зрабіць. І я буду пра гэта пісаць.

Падчас мерапрыемства ўсе госці маглі задаць любое пытанне пісьменніку (нават самае правакацыйнае) і атрымаць аўтограф. Больш за тое, кожны ахвотны мог азнаёміцца з тэматычнай выставай, у якой сабраны матэрыялы з фондаў бібліятэкі аб жыццёвым і творчым шляху Мікалая Чаргінца, таксама там былі рэдкія экзэмпляры кніг з асабістага архіва аўтара.

***Лізавета ГОЛАД,***
**фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

## Вернісаж



# «1,10

## Спадчына Малевіча

**Рэспубліканская выстава «1,10 квадрата», прымеркаваная да 110-годдзя «Чорнага квадрата» Казіміра Малевіча, адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

Экспазіцыя арганізавана сумесна з Беларускім саюзам мастакоў. Гледачам прадстаўлены разнастайныя творы віцебскіх мастакоў, натхнёныя як творчасцю Казіміра Малевіча, так і ўвогуле супрэматызмам. Трэба адзначыць, што гэта першая выстаўка агульнага аднайменнага праекта, які будзе праходзіць на працягу года на розных выставачных пляцоўках Беларусі.

— Думаю, у Віцебску кожны мастак лічыць сябе абавязаным хоць

# «Фантасты ў нас ніколі не перавядуцца»

## Гутарка з пісьменнікам Алесем Бычкоўскім пра асаблівасці жанру і літаратуру ўвогуле

**Беразіно — самы што ні ёсць правінцыйны гарадок на Міншчыне. Хаця, можа быць, самім жыхарам гэтай старонкі і крыўдна чуць такое вызначэнне... У любым выпадку Беразіно — не такі і блізкі свет ад Мінска... І ўсё ж гэты невялікі гарадок мне бачыцца своеасаблівым цэнтрам асветніцкага, кніжнага жыцця. Уражваюць памкненні супрацоўнікаў раённай бібліятэкі стварыць у горадзе і раёне атмасферу шырокай увагі да кнігі, да чытання. Гэта дарагога варта. Уражвае і тое, што ў горадзе і раёне жывуць, працуюць людзі, нераўнадушныя да мастацкага слова. Яркая асоба сярод іншых — журналіст і пісьменнік Алесь Бычкоўскі. Апошнім часам імя яго ўсё часцей сустракаецца ў рэспубліканскім друку. На нашы пытанні і адказвае літаратар з Беразіно, аўтар некалькіх даволі цікавых кніг.**

***— Алесь, якім для пісьменніка з Беразіно быў 2023 год? Што з задуманага ўдалося напісаць, што надрукавалі?***

— Год добрых і прыемных уражанняў ад жыцця ў нашай невялікай правінцыі. Праўда, з улікам асабістай занятасці ў роднай раённай газеце на літаратурную творчасць часу застаецца мала. Але пішацца якраз тое, што трэба. Напрыклад, у лістападаўскім нумары «Маладосці» за 2023 год выйшла мая аповесць «Вясковыя легенды». Яна пра музыку, які прыехаў у пошуку натхнення ў вёску, і пра бабулю, якая жыве там не менш чым тысячу гадоў, чакае кагосьці і перыядычна наведваецца да таямнічага каменя на беразе возера. У фінале застаецца пытанне: мо музыку — чалавеку творчаму — усё прымроілася? Аповесць нельга назваць фантастычнай, аднак пэўныя элементы фэнтэзі, замешанага на айчынным фальклоры, у ёй прысутнічаюць. Здаецца, прыхільнікі фэнтэзійнага жанру ўбачаць у аповесці менавіта фэнтэзі, а аматары, так бы мовіць, сур'ёзнай літаратуры ўбачаць там камічную драму з элементамі казкі.

Яшчэ мае творы трапілі ў кнігі серыі «Сучасная беларуская літаратура», што вельмі прыемна. Праект выдавецтва «Аверсэв» і Саюза пісьменнікаў Беларусі ўражвае... Часам і не задумваешся, што ў нас гэтулькі цікаавых творцаў... У самай свежай кнізе серыі — зборніку «Планета ў падарунак» — змешчана мая аповесць «Зачараваная шафа». Твор расказвае пра хлопчыка, які хацеў пачуць казку, і пра казачніка, які ледзь даў рады, апынуўшыся ў цэнтры падзей, можна сказаць, чыйгосьці твора. Аповесць друкавалася летась таксама ў «Маладосці» і грунтуецца на элементах навуковай фантастыкі.

Таксама надрукавана адно апавяданне ў рамках конкурсу ўрадавай і парламенцкай газеты «Звязда». Конкурс прыцягвае ўвагу многіх аўтараў якраз з глыбінкі, за што мы і ўдзячны «Звяздзе». Прытым апавяданне зусім далёкае ад фантастыкі, хутчэй сямейная драма.



А вясною мая дзіцячая казка «Мураш-падарожнік» трапіла ў кнігу «Вясёлка-65», і гэта мяне парадавала асабліва. Так што цалкам год атрымаўся выдатны, вельмі плённы.

***— Вы ў асноўным працуеце ў адным кірунку, у адным жанравым абсягу літаратуры. Якім вам падаецца сённяшні стан айчыннай фантастыкі? Чаго не хапае для яе болей шырокага развіцця?***

— На беларускай прасторы фантастыка ўласна ў чыстым выглядзе — з'ява даволі эпізадычная. Для мяне было блізка, што пісалі ў свой час Андрэй Паўлухін, Серж Мінскевіч і часам Юры Станкевіч (напрыклад, яго знакамітая «П'яўка»). Праўда, адзін, здаецца, перастаў пісаць, а другіх ужо і на свеце няма. Аднак сустракаюцца рэдкія людзі, напрыклад, Сяргей Белаяр, якія пішуць у названым жанры пастаянна, дадаючы дэтэктыўную інтрыгу. Раней у жанры «цвёрдай» навуковай фантастыкі працаваў Алесь Аляшкевіч (можа быць, памятаеце яго «Век Вадаліва»?) і некаторыя іншыя. А вось фэнтэзі ў нас пішуць вельмі многія. Напрыклад, я ў захапленні ад творчасці Надзеі Ясмінскай, якая стварыла цэлы сусвет. У тым жа шэрагу творы Людмілы Рублеўскай. Цікава піша Маргарыта Латышкевіч. Варта ўспомніць Раісу Баравікову з кнігай «Вячэра манекенаў», Валянціна Маслюкова з эпапеяй «Нараджэнне чараўніцы» і шмат каго яшчэ. У плане фэнтэзі імён у нас, і праўда, безліч, і многія працуюць на мяжы жанраў. Мне здаецца, што фантастычныя кірункі ў беларускай літаратуры — справа для энтузіястаў-аматараў. І калі паглядзець на іх колькасць, за стан айчыннай фантастыкі можна не хваляваццa — фантасты ў нас ніколі не перавядуцца. Можа, нам не хапае асобнага «фантастычнага» выдання, накшталт легендарнага часопіса канца 80-х — пачатку 90-х «Фантокрим-MEGA»? Але гэта ўжо іншая тэма...

***— У 2023 годзе вы як аўтар спрычыніліся да такога па задумцы маштабнага праекта, як серыя кніг «Сучасная беларуская літаратура». Ці заўважыў чытач вашы публікацыі ў зборніках серыі?***

— Адназначна! У нас горад невялікі, таму мае чытачы адразу зацікавіліся. Тым больш што ў шэрагу надрукаваных твораў не толькі фантастыка. Асобныя чытачы ўжо нават падзяліліся меркаваннямі пры асабістай сустрэчы. Прыемна было пачуць водгукі пра апавяданні «Анёл Гаўрыла» і «Ведзьма». Гэтыя творы для мяне не вельмі характэрныя, але чытачам спадабаліся, прычым «Ведзьма» быў успрыняты на «ўра» з-за гумарыстычнага складніка. Нават зрабіў для сябе выснову, што з гумарам часам і варта пісаць сур'ёзныя рэчы.

***— Вы жывяце ў невялікім гарадку на памежжы Міншчыны і Магілёўшчыны. Гэта не з'яўляецца перашкодай да пашырэння пісьменніцкай вядомасці, да самой літаратурнай працы?***

— Жыццё ў невялікім ціхім гарадку толькі спрыяе творчасці. Беразіно прыгажэе з кожным годам, і за апошнія дзесяць гадоў горад часам і не пазнаць. Шыкоўны басейн, спартыўныя комплексы, новыя шматкватэрныя дамы, месцы адпачынку, дагледжаныя вуліцы. Яшчэ ж у нас рака пад бокам — летам радасць. Мясцовым жыхарам ужо звычна, часам мо і не прыкмячаюць прыгажосці, а вось гасцям са сталіцы ў нас заўсёды прыемна. Ведаю пра людзей, якія наўмысна едуць да нас за сто кіламетраў, каб трапіць на нашу рэчку. Тут у нас неапісальная прырода, урочышчы, лясы, улетку выдатна адпачываецца. Для творчага чалавека тут райскія ўмовы. А наконт вядомасці магу сказаць, што залішняя вядомасць можа добра сапсаваць творчы працэс у пісьменніка, выклікаць пэўны крызіс. Напрыклад, асабіста я пішу не дзеля папулярнасці, а выключна з-за памкненняў прыдумаць цікавую і захапляльную гісторыю, ад якой у чытача зойме дух. Калі вось атрымаецца хоць раз напісаць такі твор, значыць, усё недарэмна. Хаця пэўная вядомасць у меру павінна быць, каб падаграваць агеньчык натхнення. Але часам варта быць удзячным і наяўнасці ўсяго некалькіх чытачоў.

***— А што самі як чытач заўважылі ў беларускай літаратуры 2023 года?***

— Як для мяне, то сапраўдная падзея — выхад у «Мастацкай літаратуры» кнігі пра даследаванне «Тараса на Парнасе». Упершыню пазнаёміўся з названым творам у школе, класе ў трэцім. Цікава, што і ў школе, і ва ўніверсітэце нам расказвалі, што аўтарства паэмы невядомае. А тут такое раптоўнае адкрыццё, якое, як аказалася, зусім не раптоўнае — даследчык збіраў і аналізаваў інфармацыю цягам доўгіх гадоў, каб устанавіць аўтарства Канстанціна Вераніцына. Прызнаюся, я быў у ліку першых пакупнікоў гэтага шыкоўнага выдання.

Значная падзея года — выхад згаданай серыі кніг «Сучасная беларуская літаратура», у якой прадстаўлены сучасныя творцы ў самых розных жанрах. Адны з найлепшых твораў Алены Брава, Алеся Бадака, Андрэя Федарэнкі і многіх іншых айчынных пісьменнікаў проста неабходна было сабраць пад адной вокладкай і ў адной серыі, як мінімум дзеля таго, каб знаёміць з імі новых чытачоў.

На нашым правінцыйным узроўні адметныя падзеі года — гэта два літаратурныя фестывалі, не пабаюся сказаць, рэспубліканскага ўзроўню, праведзеныя раённай бібліятэкай. Дзякуй усім, хто рыхтаваў гэтыя творчыя, бібліятэчныя праекты. Дзякуй і Выдавецкаму дому «Звязда», Саюзу пісьменнікаў Беларусі, якія падтрымалі фестывалі.

З выдадзенай прозы закрануў і ўразіў новы раман Андрэя Федарэнкі «Сцэнарыст». Аўтар у які раз пацвердзіў званне майстра не толькі глыбокай мастацкай прозы, але і ліха закручанай дэтэктыўнай інтрыгі. За дэтэктыўнымі рамкамі ў рамане праглядаецца моцны філасофскі пласт: сапраўдны Сцэнарыст — той, хто з вялікай літары — Бог. Мяне гэта вельмі ўразіла.

Гэта цалкам уражанні ад таго, што я паспеў пабачыць і прачытаць. Зразумела, за ўсімі навінкамі не паспееш.

***— Ці турбуе вас стан беларускай літаратурнай крытыкі? І ўвогуле, ці патрэбна яна, крытыка, пісьменніку?***

— Крытыка, несумненна, павінна быць, але прафесійная і неананімная. Сёння інтэрнэт дае магчымасць каму заўгодна стаць крытыкам пад псеўданімам, і горшай долі не прыдумаць, калі трапляеш пад такую крытыку аглабельнага характару. А вось добрай крытыкі ў літаратурна-мастацкіх выданнях павінна быць у дастатковай колькасці. Айчынных пісьменнікаў варта хваліць і падтрымліваць, таму станоўчая канструктыўная крытыка павінна мець месца. Крытыка неабходна і дзеля таго, каб літаратары не цягнулі ў літаратуру размаітую пошласць, гвалт, трэш, усякі там сексуальна-дэвіянтны кантэкст, мацюкі і безгустоўшчыну. Хоць я не лічу сябе слупом маралі, але ж мяркую, што нават эротыка павінна быць мастацкай і прыгожай. З той нагоды хочацца асобным аўтарам сказаць словамі з вядомага анекдота: вас жа дзеці чытаюць.

***— Давайце паспрабуем зазірнуць у творчую лабараторыю пісьменніка Алеся Бычкоўскага. З якой кнігай прыйдзеце да чытача ў 2024 годзе?***

— Падрыхтаваў невялікі зборнік аповесцяў і апавяданняў, большасць якіх друкаваліся ў «Маладосці» і «Полымі». Усе яны на мяжы жанраў, дзе змешваецца рацыянальнае з ірацыянальным, рэалізм з казкай, фэнтэзі, навуковай фантастыкай, дзе раптам здараецца цуд і чытачу выпадае магчымасць ўздыхнуць: «Дзякуй, Божачка, гэта здарылася не са мной», дзе застаецца месца гумару, а часам і скрусе, але абавязкова са шчаслівым фіналам.

Яшчэ мяркую пераклаці на рускую мову маю кнігу «Ацалелы, або Вясёлыя хаўтуры» для маіх расійскіх сяброў. Гэта не фантастыка, а трагікамічны дэтэктыў, спроба пісаць «нефантастыку». Пачынаецца з таго, што чалавек ачомаўся ў труне, цудам выкараскаўся з долу на могілках, а потым спрабуе высвятліць, хто ж яго туды «ўпакаваў», і ўсё вакол яго насычана неслабымі прыгодамі. Кніга на адзін вечар.

Зразумела, планы — гэта ўсяго толькі планы, бо, як кажуць, «человек предполагает...»

**Гутарыў Кастусь ХАДЫКА,**
*Беразіно — Мінск.*

---

# КВАДРАТА»

### ў сучасным мастацтве

адну працу ў сваім жыцці прысвяціць Казіміру Малевічу, бо гэта горад, у якім практычна нарадзіўся Парыжская школа і супрэматызм, — распавядае **першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў, мастацтвазнаўца Наталля ШАРАНГОВІЧ.** — Мне здаецца, што прыцягальнасць авангарда таго часу застаецца і сёння. Мы спрабуем трансфармаваць авангард і паказаць, што ў пэўны момант часу «Чорны квадрат» прарваў мастацтва і даў зразумець: погляд на яго можа быць іншым. Праз піксель, кропку ці экран можна зусім па-іншаму ўспрымаць свет.

Паводле яе слоў, на выставе прадстаўлены аўтары розных стыляў і пакаленняў, але кожны з іх, з аднаго боку, робіць сваё мастацтва эмацыянальным, а з другога — вельмі філасофскім. Напрыклад, на выставе прадстаўлены дыптых «Цырк. Сланы ідуць на прышчэпку» Валянціны Ляховіч. Мастачцы 78 гадоў, але яна да гэтага часу не проста працуе, але сапраўды займаецца актуальным мастацтвам. Сярод усіх карцін вельмі вылучаліся сваёй унікальнасцю творы маладой мастачкі





Віялеты Някрасавай, выкананыя ў аўтарскай тэхніцы. Гэта неверагоднае спалучэнне тэкстылю, фарбаў і творчай ідэі. Таксама на выставе можна ўбачыць і творы мастака-манументаліста Васіля Васільева, які піша не толькі вялікія манументальныя творы і стварае арт-аб'екты, але і з'яўляецца куратарам шматлікіх мерапрыемстваў, прысвечаных авангарднаму мастацтву.

У некаторых гледачоў можа ўзнікнуць пытанне да назвы выставы: чаму менавіта «1,10 квадрата»?

— Назва выставы вельмі канцэптуальная, як і яе змест. У ім можна ўбачыць алюзію на 110-гадовы юбілей, — тлумачыць загадчыца сектара мастацкіх выставак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вікторыя Харытонава. — Яшчэ «0,10» — гэта назва апошняй футурыстычнай выставы карцін, на якой у 1915 годзе Казімір Малевіч прадставіў свае абстрактныя работы і канцэпцыю супрэматызму.

Паводле яе слоў, нуль сімвалізуе адсутнасць форм, бо кірунак супрэматызму прадугледжваў знаёмства з жывапісам без увагі да контураў і аб'ёмаў твора. А «10» адсылае да дзесяці мастакоў, якія павінны былі ўдзельнічаць у выставе ў 1915 годзе. У выніку іх аказалася шэсць чалавек, але назву выставы пакінулі «0,10».

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего РУПП «Гроднотекстиль»**

**Аукцион состоится 15.02.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона |
|---|
| **Лот № 1** |

ЛОТ 1:
- Капитальное строение, инв. № 400/С-17193 (назначение – здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий, наименование – главный производственный корпус), площадью 29971,7 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, состоящее из капитального строения, инв. № 400/D-152212 (назначение – производственное помещение, наименование – главный производственный корпус), площадью 29418,5 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-2 и капитального строения, инв. № 400/D-123114 (назначение – помещение неустановленного назначения, наименование – помещение неустановленного назначения), площадью 523,0 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г-1;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-165708 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – благоустройство), площадью 6813 кв. м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г, благоустройство;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-85888 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – канализационная сеть), протяженностью 586,05 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97346 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная фекальная канализация), протяженностью 325,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная фекальная канализационная сеть к зданию главного производственного корпуса;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-89982 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная ливневая канализация), протяженностью 1940,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-165712 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – ливневая канализация), протяженностью 1077,2 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, участки ливневой канализации от здания 121Г;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-89983 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внеплощадочная напорная канализация), протяженностью 243,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-55845 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внеплощадочная кабельная линия, напряжением 10 кВ), протяженностью 1018 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-74384 (назначение – сооружение специализированное связи, наименование – внутриплощадочная телефонная канализация), протяженностью 193,20 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-165711 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – водопроводная сеть), протяженностью 57,3 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, участки водопроводной сети к зданию 121Г;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-74876 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 227,80 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-74877 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный пожарный водопровод), протяженностью 991,36 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97384 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная сеть наружного освещения), протяженностью 420,40 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная сеть наружного освещения зданий и сооружений главного производственного корпуса;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97380 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная электрическая сеть 0,4 кВ), протяженностью 353,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, электрическая сеть 0,4 кВ к зданиям и сооружениям главного производственного корпуса;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-97392 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ), протяженностью 473,70 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121, внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ от РП-10 кВ до ТП-1, от ТП-1 до ТП-2;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-55838 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная напорная канализация), протяженностью 277,25 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-55842 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочный производственный водопровод), протяженностью 1305,15 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Капитальное строение, инв. № 400/С-85887 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – мостовое сооружение), протяженностью 48,00 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- Внутриплощадочная кабельная линия 10 кВ марки ААБл3*95, протяженностью 155 м, г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- пункты и шкафы распределительные – 67 единиц;
- трансформаторная подстанция – 3 единицы;
- панель ЩО-7024;
- трансформатор масляный – 6 единиц;
- трансформаторные ячейки КРУ-821-00848 – 2 единицы;
- дизель-генератор ДГА-3-48;
- камера КСО – 3 единицы;
- туя - 3 единицы.

Лот № 1 расположен на земельных участках:
- кадастровый номер 440100000002000562, площадью 4,2555 га (назначение – обслуживание зданий и сооружений главного производственного корпуса) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121Г;
- кадастровый номер 440100000002006864, площадью 0,0078 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- кадастровый номер 440100000002006865, площадью 0,0016 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- кадастровый номер 440100000002006866, площадью 0,0014 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121;
- кадастровый номер 440100000002006867, площадью 0,0073 га (назначение – земельный участок для обслуживания пешеходного моста) по адресу: г. Гродно, ул. Максима Горького, 121.

Обременений со стороны третьих лиц нет.

Условия проведения аукциона:
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 3 % от конечной цены продажи объекта;
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по проведению независимой оценки в размере 2 161,50 руб.

| | |
|---|---|
| **Начальная цена продажи** | 3 329 602,62 руб. (три миллиона триста двадцать девять тысяч шестьсот два рубля шестьдесят две копейки) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 332 960 руб. (триста тридцать две тысячи девятьсот шестьдесят рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 13.02.2024 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.07.2023 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего открытому акционерному обществу «Молочный Мир» (Щучинский филиал)**

**Аукцион состоится 19.02.2024 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| **Лот № 1** | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-3647 (назначение – здание специализированное для органов государственного управления, обороны, государственной безопасности, внутренних дел, наименование – казарма), общей площадью 2033,9 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Островского, 35;<br>- капитальное строение, инв. № 422/С-27534 (назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – сооружение благоустройства к зданию № 35), общей площадью 0,0 кв. м, расположенное по адресу: г. Щучин, ул. Островского, сооружение благоустройства к зданию № 35;<br>- зеленые насаждения (береза, инв. № 01900014701, каштан инв. № 01900014702).<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 425850100004000123, площадью 0,3077 га (назначение – для содержания и обслуживания здания казармы) по адресу: г. Щучин, ул. Островского, 35 |
| **Начальная цена продажи** | 72 090,00 руб. (семьдесят две тысячи девяносто рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 7 209 руб. (семь тысяч двести девять рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 15.02.2024 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 19.12.2023 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
